Прылетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	7 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	—20 к.
мясцовыя	—10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нашпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нашпарэлі насярод тэксту	1 р. — к.
За радок нашпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпецыяльны на 50 проц. даражэй. Зьыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Бесплатныя і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 262 (2154) Субота, 19-га лістапада 1927 г.

II зьезд КП(б)Б

адчыняецца 22-га лістапада а 18-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу Карла Маркса.

Мандаты выдаюцца ў памяшканьні ЦК КП(б)Б, пакой № 9.

Арганізацыйная камісія.

Вынікі здрады.

Падзеі, якія зараз адбываюцца ў Кітаі, вельмі навучальны. Вынікі здрады правадыроў партыі гаміндан, вынікі іх лютай расправы з масавым рэвалюцыйным рухам разгарнуліся з надзвычайнай яснасьцю. Ранейшыя правадыры рэвалюцыі, здрадзіўшыя ёй, зараз-жа зусім адкрыта зрабіліся агентамі замежнага імпэрыялізму.

Год таму назад кітайская рэвалюцыя была на ўздыме. Сусьветны імпэрыялізм добра разумеў, што ў аснове не перамог ляжыць магутны рух мілённых рабоча-сялянскіх мас. І страх перад напорам мас прымушаў яго найсьці на ўступкі.

Гэтак было год назад. А зараз?

Зараз, пасьля разгрому масавай рэвалюцыі, нават занепалы, поўжывы гішпанскі імпэрыялізм прад'явіў Кітаю пратэст з прычыны якогасьці «парушэньня» якогасьці рабаўнічага дагавору. Японія, ужо абярнуўшая ў сваю калёнію палову Манчжурыі (крайная паўночная вобласьць Кітаю), хоча забраць і другую яе палову, І ў гэтай справе ёй дапамагае ранейшы галоўнакамандуючы рэвалюцыйнымі войскамі генэрал-здраднік Чан-Кай-шы.

Як відома, у мінулым кастрычніку, калі нанкінскаму ўраду пагражала пагібель, Чан Кай-шы прымушан быў падаць у адстаўку і пакінуць пасаду галоўнакамандуючага нанкінскім войскам. Хутка пасьля гэтага ён выехаў у Японію. Зараз існуюць чуткі, што ён зноў стане на чале нанкінскай армії і што ён у Японіі заручыўся згодаю японскага ўраду не перашкаджаць аднаўленьню апэрацый нанкінскіх войск супроць Чжан-Цзо-ліна.

Цяжка сказаць ці маюць гэтыя чуткі пад сабою глебу, але ў кожным выпадку яны падобны да праўды.

Справа ў тым, што Чжан Цзо Лін, —раней пакорны слуга Японіі — пачаў за апошні час выяўляць некаторую ўпартасьць. Ён асьмельваецца на ісьці насустрач японскім плянам аб канчатковым падпарадкаваньні Манчжурыі.

Тлумачыцца гэта тым, што на Чжан Цзо-ліна робіць уплыў узросшая за апошнія гады ў Манчжурыі кітайская буржуазея, якая ўсё больш і больш незадаволена гаспадарчай і палітычнай апекай Японіі. Але, непаслухмянасьць Чжан Цзо-ліна ў адносінах да Японіі, галоўным чынам, тлумачыцца тым, што за апошні час ён пачаў усё больш і больш карыстацца апекаю Англіі. Інтарэсы-ж Японіі і Англіі ў Кітаі далёка не супадаюць.

Як-бы там ні было, а Японія нічога ня мае супроць таго, каб „правучыць" Чжан Цзо-ліна. Іменна таму яна можа дазволіць Чан-Кай-шы ня толькі наступаць супроць Чжан-Цзо-ліна, але і адсунуць яго на поўнач. Дазволіць гэта яна можа так ахвотна таму, што ўдзячны Чан-Кай-шы, які зараз гаспадарыць у значнай частцы Ян-Цзы, мабыць не адмовіцца дапамагчы Японіі панырыць яе ўплыў у гэтым важным райёне за кошт скараўэньня ўплыву Англіі.

Ці гэта значыць, што Японія ня будзе перашкаджаць і канчатковаму разгрому Чжан-Цзо-ліна ў выпадку посьпеху войск Чан-Кай-шы?

Не, гэта наўрад ці будзе так. Чжан Цзо-лін усё такі—стары слуга, і яго, мабыць, удасца прымусіць да пакоры адным-двума наражэньнямі. Апроч таго, Японія зусім не зацікаўленая ў аб'яднаньні Кітаю хоць-бы пад уладаю контррэвалюцыйнай сілы.

Але пры гэткіх умовах тым больш агіднай зьяўляецца палітыка Чан-Кай-шы. Апынуўшыся без падтрыманьня мас, ён ня толькі прымушан прасіць дазволу Японіі на аднаўленьне паходу супроць Чжан-Цзо-ліна. У часе паходу ён ня зможа ўжо выступіць як перадавая сіла, якая ідзе да аб'яднаньня Кітаю. **Ён можа выступіць толькі як звычайная пешка ў руках Японіі.**

Крок да сусьветнага адзінства с.-г. рабочых.

МАСКВА. У Маскве прадстаўнікамі саюзаў сельска-гаспадарчых і лясных рабочых Нарвэгіі, Фінляндыі і СССР падпісан угавор аб заснаваньні Нарвэска-Фінска-Расейскага камітэту адзінства і прымусьвы дзеля ўсямернага матар'яльнага і маральнага падтрыманьня ў часе лёнаўтаў і стачак, а таксама барацьбы за заснаваньне адзінага бявога Інтэрнацыяналу, праз папярэдні склік сусьветнага прафсаюзнага кангрэсу і рашучую барацьбу проці падрыўтоўваемых імпэрыялістамі войн.

Саюзы сельска-гаспадарчых і лясных рабочых азнач. краёў Нарвэгіі, Фінляндыі і СССР зьвярнуліся да с.-г. і лясных рабочых усіх краёў з адозваю, якая прапануе ставіць на сходах, зьездах і кангрэсах пытаньне аб далучэньні да Нарвэска-Фінска-Расейскага камітэту.

МІЖНАРОДНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ С.-Г. І ЛЯСНЫХ РАБОЧЫХ.

МАСКВА, 18-XI. У Маскве адбылася міжнародная канфэрэнцыя сельска-гаспадарчых і лясных рабочых. Прысутнічалі дэлегаты ад унітарнае фэдэрацыі рабочых **Францыі**, ад **нарвэскага** саюзу сельска-гаспадарчых рабочых, ад **фінскага** саюзу с.-г. і лясных рабочых, а таксама прадстаўнікі **эстонскага, швэдзкага, канадзкага і ірляндзкага саюзаў сельска-гаспадарчых і лясных рабочых.**

На канфэрэнцыі прысутнічалі сябры прэзыдыуму ЦК саюзу с.-г. і лясных рабочых СССР.

Дэлегаты заслухалі даклад аб працы саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых СССР за 10 год. Па затрабаваньні французкае дэлегацыі канфэрэнцыя абмеркавала таксама пытаньне аб ваеннай небясьпецы. **Нарвэская дэлегацыя афіцыйна запрасіла прадстаўнікоў ЦК саюзу с.-г. і лясных рабочых СССР наведацца ў Нарвэгію** з мэтаю замацаваць прыяцельскія ўзаемадачыненьні сельска-гаспадарчага пралетарыяту абодвых краёў.

Усе дэлегацыі заявілі, што ў момант, калі ваенная небясьпека стане рэальнаю, яны ўжывуць усе захады, каб **забясьпечыць СССР магчымасьць мірнае працы.**

Нацыянальная эканамічная рада ў Францыі.

ПАРЫЖ, 17-XI. Рада міністраў ухваліла водлуг прапановы Пуанкарэ законапраэкт аб заснаваньні, арганізацыі і парадку дзейнасьці нацыянальнае эканамічнае рады. Рада, у склад якое ўвойдуць прадстаўнікі спажыўцоў, прафэсыянальных саюзаў, эканамічных, прамысловых і камэрцыйных асацыяцый, будзе мець дарадчыя функцыі. Рада будзе складацца з 150 членаў. Рада вылучыць сталыя камісіі з мэтаю спэцыяльнага вывучэньня розных галін эканамічнае дзейнасьці. Дырэктары і генэральныя сэкратары аддзелаў розных міністэрстваў здолеюць браць удзел у пасяджэньнях рады пры абмеркаваньні цікавячых іх пытаньняў на правах членаў рады.

Увага: эканамічная рада складзена ўпяршыню пры першым урадзе Эрыё, пасьля прыходу да ўлады левага блёку, але існавала толькі на паперы.

Рост прамысловага крызісу прымусіў рэфарміскую канфэрэнцыю працы выступіць з патрабаваньнем стварыць дзяржаўны эканамічны орган, заклікаць „абнавіць" сыстему дзяржаўнага кіраваньня. Прапанова Пуанкарэ зьяўляецца адказам на гэтае патрабаваньне.

ШТРЭЗЭМАН АБ СВАЙМ ПАДАРОЖЖЫ Ў ВЕНУ.

БЭРЛІН, 17-XI. 17-га лістапада на прыёме прадстаўнікоў друку Штрэзэман сказаў прамову, у якой высьмейваў паведамленьні, зьвязваючыя з яго падарожжам ў Вену і з падпісаньнем франка-югаслаўскага ўгавору. Падкрэсьліваючы аўстра-нямецкую культурную агульнасьць і неабходнасьць сталага абмену думкамі між абодвымі бакамі, Штрэзэман заявіў, што напружана нервуюцца тыя, хто ў абмене пашпартовых візаў у падарожжах між Аўстрыяй і Нямеччынай, а таксама ў дапасаваньні прававых рэформ праводзімых абодвымі краінамі бачаць адзнаку паступовага далучэньня Аўстрыі да Нямеччыны.

„Нафтавая анамалія" ў Амэрыцы.

НЬЮ-ЁРК, 4-XI. Калюмбійскі ўрад правёў у законадаўчым парадку акт аб «нацыяналізацыі нафтаносных земляў». Згодна новага закону, у будучым урад будзе ўдзельнічаць у палавіннай частцы прыбыткаў ад усіх нафтавых канцэсій, якія даюцца як калюмбійскім, так і чужаземным капіталістам. Мэта гэтага мерапрыёмства, водлуг слоў калюмбійскага міністра прамысловасьці, у тым, каб «урад кіраваў і кантраляваў прамысловасьцю не манапалізуючы яе».

Закон «аб нацыяналізацыі нафтаносных земляў», як відаць, накіраваны ў некаторай ступені проці сусьветных нафтавых трэстаў і ў першую чаргу проці «Стандард Ойль», якім належыць большасьць нафтаносных вучасткаў Калюмбіі.

ПОЎНАЕ ПАРАЖЭНЬНЕ АПАЗІЦЫІ.

ПРАЛЕТАРЫІ ТЫСЯЧАМІ ІДУЦЬ У ПАРТЫЮ ЛЕНІНА.

Паражэньне трацкістаў у ячэйках Масквы.

МАСКВА, 17-XI. Ад пачатку дыскусіі да 16 лістапада ўключна па Маскве абмяркоўвалі тэзісы ЦК і ЦКК 883 ячэйкі. Прысутнічала 65.405 чалавек. Галасавала за тэзісы 63.721 чалавек, проці 1.249. Устрымалася ад галасаваньня 437.

Па паветах тэзісы ЦК і ЦКК абмяркоўвалі 273 ячэйкі, прысутнічала 10.655. За тэзісы галасавала 10.557 чалавек, проці 54 чал., устрымалася ад галасаваньня 44.

Правал апазіцыі ў Ташкенце.

ТАШКЕНТ. У совым Горадзе па 6-ці сходах ячэек абмяркоўваліся тэзісы ЦК; прысутнічала 4775. За лінію ЦК галасавала 4740 проці 13, устрымалася 12.

У Старым Горадзе на 9-ці куставых сходах прысутнічала 356. За лінію апазіцыі выказалася 3, проці тэзісаў галасаваў 1, устрымалася 4.

Адыход ад апазіцыі.

ТЫФЛІС, 18-XI. У партыйную арганізацыю пададзена 240 заяў ад ранейшых апазіцыянэраў аб закасаваньні сваіх подпісаў пад заявою «83»-х.

* * *

ЯРАСЛАЎЛЬ. На агульным сходзе рабочых аўтазаводу імя Зіноўева, пастаноўлена перайменаваць завод у „Яраслаўскі аўтамабільны завод рэвалюцыйнага байца, першага будаўніка народнае гаспадаркі СССР т. Дзяржынскага".

Адказ пралетарыяў на паклёпы апазіцыі.

Больш 5.000 заяў па Маскве.

МАСКВА, 17-XI. На 17 лістапада па Маскве і паветах ад рабочых і работніц пададзена 5.497 заяў аб прыёме ў партыю.

Яшчэ 186 новых партыйцаў у Баку.

БАКУ, 16-XI. Апрача 1200 рабочых, увайшоўшых у партыю ў зьвязку з 10-цігодзьдзем Кастрычніка і выступленьнем апазіцыі, за апошнія тры дні па адным толькі Сураханскім райёне лепшыя кваліфікаваныя рабочыя падалі 186 заяў аб уваходзе ў партыю.

Каля 3000 арцёмаўцаў у партыю.

АРЦЁМАЎСК, 17-XI. Да сёньняшняга дню ў акруговыя партыйныя арганізацыі паступіла 2886 заяў ад рабочых, жадаючых уступіць у кампартыю.

Развал апазіцыі на Ўрале.

СЬВЯРДЛОЎСК, 17-XI. На акруговую партыйную канфэрэнцыю зьявіўся „з павінаю" выключаны з парты і за фракцыйную працу т. Кугоўнікаў, быўшы да апошняга часу сэкратаром падпольнага уральскага вобласнага камітэту. Ён заявіў: „Апазіцыя на Урале мела глыбокіх карэньняў. Зараз пачаўся зялёг развал апазіцыі. Блізкайшымі днямі вы будзеце сьведкамі развалу трацкісцкае партыі". Кугоўнікаў перадаў канфэрэнцыі заяву аб прыёме яго назад у камуністычную партыю.

БУРЖУАЗНАЯ ПРЭСА АБ СТАНОВІШЧЫ Ў УсеКП(б).

„Папярэджаньне" «Дэйлі Тэлеграф».

ЛЁНДАН, 17-XI. Абмяркоўваючы рэвалюцыю ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб антыпартыйных учынках лідэраў трацкісцкае апазіцыі, дыпляматычны асьведамлены „Дэйлі Тэлеграф" піша: «Было-б нерозумна думаць, што выключэньне Троцкага азначае ў будучым значныя зьмены ў палітыцы Масквы ў адносінах да рэшты сьвету. Тыя, хто думае, што ўдзел СССР у жэнэўскіх нерамовах—адзнака яго хуткага замірэньня з Лігаю, павінны ўспомніць, што заявіў наконт гэтага Сталін".

АЎСТРЫЙСКАЯ ПРЭСА АБ «героях дэмакратыі».

ВЕНА, 16-XI. Увесь аўстрыйскі друк жвава абмяркоўвае выключэньне Троцкага і Зіноўева з УсеКП(б). Органы буйнае буржуазеі і сацыял-дэмакратычныя газэты выхваляюць прыгэтым Троцкага, як «гэроя дэмакратыі».

Абвостраньне становішча ў ангельскай прамысловасьці.

БАЛЬДВІН УХІЛІЎСЯ АД АБГАВОРУ ПЫТАНЬНЯ Ў ПАЛАЦЕ.—„ПАГРОЗЫ" МАКДАНАЛЬДА.

ЛЁНДАН, 17-XI. Агенцтва Рэйтар паведамляе: адказваючы ў палаце вобшчын Макданальду, Бальдвін заявіў: «У зьвязку з тым, што адбылося ўчора ў палаце вобшчын (маецца на ўвазе наладжаная ўчора дэпутатамі рабочае партыі абструкцыя з мэтаю дамагчыся выступленьня Бальдвіна па пытаньні аб становішчы вугольнае прамысловасьці), ён ня можа даць дазволу на далейшы працяг спрэчак па пытаньні аб становішчы ў вугольнай прамысловасьці. Макданальд заявіў, што апазіцыя «напросіць назначыць дзень для абмеркаваньня гэтае пастановы ўраду і адказнасьці прэм'ер-міністра».

НОВАЯ СПРОБА АБЦЯЖАРЫЦЬ ГАНДАЛЬ З СССР.

ЛЁНДАН, 17-XI. Адзін з кансэрватыўных дэпутатаў палаты вобшчын прапанаваў увесьці невялікі падатак на тавары, якія ўвозяцца з СССР і гэтыя паступленьні выкарыстаць на кампэнсацыю пацярпеўшых у СССР ангельскіх грамадзян, якія зараз адчуваюць патрэбу. Чэрчыль заявіў, што мае намер у сучасны момант радзіць увядзеньне такога падатку.

ЗАМАХ АНГЛІІ НА ЗАВАЁВЫ ІНДУСАУ.

Байкот мусульманамі ўрадавае камісіі.

ЛЕНДАН, 17-XI. Мусульманская ліга Індыі заяўляе ў сваёй дэкларацыі, што яе прадстаўнікі ня могуць браць удзелу ў ангельскай урадавай камісіі па абсьледаваньні ажыцьцяўленьня рэформ у Індыі, калі індусы ня будуць прадстаўлены ў камісіі на роўных правах з іншымі членамі яе.

КАМПАРТЫЯ КЛІЧА БАЙКАТАВАЦЬ КАМІСІЮ.

ЛЁНДАН. 17-XI. ЦК кампартыі зьвярнуўся да камітэту ўсіндыйскага нацыянальнага кангрэсу з тэлеграмаю, у якой зазначаецца: заява парляманцкае фракцыі рабочае партыі наконт заснаваньня парляманцкае камісіі па абсьледаваньні ажыцьцяўленьня канстытуцыйных рэформ у Індыі сьведчыць, што правадыры ангельскага рабочага руху выступаюць адзіным фронтам з ангельскімі імпэрыялістамі. Тэлеграма заклікае індыйскі нацыянальны рух ні ў якой меры не давяраць ангельскім рэфармістам і вітае знайшоўшую шырокі водгук мас пастанову байкатаваць камісію.

Паражэньне ангельскіх стаўленікаў у Ірляндыі.

ЛЁНДАН, 16-XI. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Дубліну. «Пры абмеркаваньні ў парляманце Ірляндыі прапановы заснаваць камісію для разгляду патрабаваньняў ранейшых вайсковых служачых, урад пацярпеў паражэньне. За прапанову ўраду было пададзена 64 галасы, проці—66.

Урад узьніме пытаньне аб давер'і. Галасаваньне давер'я вырашыць лёс ураду.

Адпор Урбансу ад бэрлінскіх камунараў.

БЭРЛІН, 16-XI. Учора група Урбанса склікала мітынг у Бэрліне, але ў апошні момант спрабавала адкласьці яго, прадбачачы, што большасьць прысутных не належыць да прыхільнікаў групы. Мітынг, аднак, быў адчынен пад кіраўніцтвам сяброў кампартыі, і пасьля выступленьняў некалькіх прамоўцаў пераважаючаю большасьцю проці некалькіх галасоў ухваліў рэзалюцыю, у якой зазначана, што прысутныя цалкам падтрымліваюць палітыку ЦК кампартыі Нямеччыны, востра ганьбяць проціпальшавіцкія выпады групы Урбанса проці УсеКП(б) і Камінтэрну і абавязуюцца ўсімі сіламі абараняць СССР.

Такою-ж пераважаючаю большасьцю была адхілена дэклярацыя групы Урбанса.

АРЫШТ УДЗЕЛЬНІКАЎ КАСТРЫЧНІКАВАГА ВЕЧАРУ Ў КЛАЙПЭДЗЕ.

КОЎНЯ, 17-XI. «Летувос Жыніёс» паведамляе, што палітычная паліцыя арыштавала 13 удзельнікаў вечару, наладжанага рабочай партыяй у Вэшвілі, ля Мэмалю, у чэсьць 10-х угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі. У ліку арыштаваных быў дэпутат мэмальскага сойму Сураў, які крыху пазьней вызвален.

Зачыненьне польскай гімназіі ў Літве.

Дырэктар польскай гімназіі ў Панявежы атрымаў ад міністэрства асьветы паведамленьне, што польская панявежская гімназія зачыняецца таму, што праграма навук у ёй ня згодна з міністэрск. вымаганьнямі.

Новы аўстрыйскі пасол у СССР.

ВЕНА, 16-XI. «Нэйе Фрэйе Прэс» паведамляе, што аўстрыйскі пасланьнік у Маскве Поль падаўся ў адстаўку і пакідае дзяржаўную службу. Наступнікам яго мае быць Хейн. Зараз Хейн займае пасаду начальніка палітычнага бюро ў канцэляры канцлера.

Матч Алёхін-Капабланка.

БУЭНОС-Айрэс, 17-XI. 30-ю партыю матчу, адкладзеную пасьля 40 хадоў, Алёхін і Капабланка згадзіліся прызнаць нічыёю, не аднаўляючы гульні.

У Польшчы.

РАЗГОН ЛЕВАГА МУНІЦЫПАЛІТЭТУ.

ВАРШАВА, 17-XI. Гарадзкая рада ў Чэнстохаве (рабочы пасёлак у Дамброўскім райёне), быўшая раней у руках левіцы, распушчана. Замест рады ў Чэнстохаве назначаецца ўрадавы камісар.

ВЫБАРЫ Ў САМАУРАДЫ.

У шмат якіх мясцовасьцях адбываюцца апошнія выбары ў самаўрады. Гэтымі днямі адбыліся выбары ў Плоцку. Халме і Ковелі. Сьпісы тых групоак, якія ўрад лічыць намуніотычнымі, ці „камунізуючымі", пераважна пасюцца; аднак, галасаваньне адбываецца і на гэтыя сьпісы.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ВАСТРОЗЕ.

У дзень 10-годзьдзя Кастрычніка ў рэвалюцыі вязьні петракоўскага вастрогу зрабілі дэманстрацыю—засьпявалі рэвалюцыйныя песьні і выкрывалі варожыя дзя ўраду лёзунгі. Толькі праз некалькі гадзін адміністрацыі ўдалося даць сабе рады і разсадзіць дэманстрантаў па паасобных камэрах.

ПРАЦЭС ПРОЦІ КАМУНІСТАЎ.

28 лістапада пачнецца ў Ковелі яшчэ адзін з сэрыі вялікіх працэс 55 камуністаў, членаў кампартыі Зах. Украіны. 40 абвінавачаных знаходзіцца ў вастрозе. Працэс зацягнецца на некалькі тыдняў.

Арышты.

Палітычная паліцыя арыштавала на ўсходнім вакзале ў Варшаве нейкага Сьцяпана Кота, які быццам належыць да кампартыі Зах. Беларусі, і Язэпа Юрчыка, праж. на Браварнай вул. у Варшаве, яго таксама абвінавачваюць у камунізьме.

НОВЫ ГДАНСКІ СОЙМ.

На выбарах у гданскі сойм, якія адбыліся гэтымі днямі, сацыял-дэмакраты атрымалі 42 мандаты (раней—29), нац. нацыяналісты—25 (33), цэнтр 18 (15), камуністы 8, народ. лібэралы—5, нац. лібэралы—4, палякі—4. Рэзультаты выявілі паражку правых, і перамогу левых, а таксама няўдачу палякаў, якіх у папярэднім сойме было 5.

Сойм у новым будынку.

Стары будынак польскага сойму быў зусім неадпавядаючым для сойму. Калісьці ў царскія часы будынак гэты быў заняты пад „Інстытут благородных девиц". Цяпер будуецца новы будынак для сойму, які будзе гатоў у пачатку вясны, калі зьбярецца новы сойм.

Самагубства А. А. Іёфэ.

МАСКВА. 17-га лістапада на глебе нэрвовае хворасьці, выклікане цяжкаю хваробаю, якая пачалася яшчэ ў 1922 годзе, скончыў жыцьцё самагубствам ранейшы ўдзельнік берасьцейскіх перамоў, раней паўнамоцны прадстаўнік у Нямеччыне, а пазьней—у Кітаі, потым упаўнаважаны савецкага ўраду па перамовах з Японіяй, паўнамоцны прадстаўнік у Аўстрыі і ў апошні час намесьнік старшыні Галоўканцэскому А. А ІЁФЭ.

* * *

У чацьвер, 17 лістапада, позна ўвечары, як толькі разышлася вестка аб сьмерці Іоффэ, на кватэру нябожчыка сталі зьбірацца яго сябры. З 12 гадз. уночы была пастаўлена ганаровая грамадзянская варта. Раніцой 18 лістапада апрача ганаровай грамадзянскай варты была пастаўлена ваенная варта. З кватэры трупа была вынесена сябрамі нябожчыка і пастаўлена на катафалк. Працэсія накіравалася к Нар. Камісарыяту па Чужаземных Справах, дзе труна была перанесена на пастаманце. Каля труны стала першая ганаровая грамадзянскаі варта ў складзе членаў калегіі НК па Чуж. Справах Чычэрына, Літвінава, Карахана і Родштэйна. Апрача таго, была выстаўлена ганаровая варта і адчынены доступ к целу ўсім жадаючым разьвітацца з нябожчыкам. Вынас цела адбудзецца ў суботу. Пахаваньне на камуністычным вучастку Нова-Дзевічага могільніку. На труну Іоффэ ускладзен вянок ад ЦК УсеКП(б) з надпісам „Бэтэрану чырвонай дыпляматыі тав. Іоффэ ад Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)".

З прычыны сьмерці Іоффэ, Нар. Кам. па Чуж. Справах выказаў жаль японскі посол у СССР Танака, латвійскі пасланьнік Озольс і прадстаўнік Чэха-Славацкай рэспублікі Гірса.

А. А. Іёфэ.

Іёфэ А. А., нарадзіўся ў 1883 г. У партыі быў з 1902 г. За партыйную працу ў розных гарадох не адзін раз быў арыштаваны. 1914-1917 г.г. правёў у турме і ссыльцы.

Пасьля лютаўскае рэвалюцыі абраны членам Ленінградзкай думы.

У кастрычніку 1917 г.—старшыня Ленінградзкага рэвалюцыйнага камітэту. Пасьля таго працаваў на франтох грамадзянскае вайны ў якасьці члена Савету Абароны. У часе наступу Юдзеніча—член Ленінградзкага Савету Абароны. Некаторы час—старшыня туркбюро ЦК РКП. Быў таксама старшынёю мірнай дэлегацыі ў Берасьці, удзельнікам перамоў з Латвіяй, Літвой, Эстоніяй і Польшчай, членам расейскае дэлегацыі ў Генуэскай канфэрэнцыі і першым прадстаўніком РСФСР у Бэрліне.

У 1922-23 г. г. назначаецца надзвычайным паўнамоцным прадстаўніком у Пэкіне і кіраўніком перамоў з Японіяй. Пасьля прызнаньня СССР Японіяй назначаецца туды паўнамоцным прадстаўніком.

У апошні час—нам. старшыні галоўнага канцэсійнага камітэту.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-й гадзіне ўночы).

РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ВОЙСКА ІЕ-ЦІНА ЗАНЯЛО ХАЙФУН.

ШАНХАЙ, 18-XI. У райёне Хайфуна ў 220 кілёмэтрах ад Кантону рэшткі рэвалюцыйнага войска Іе-Ціна, супольна з сялянамі, арганізавалі другую дывізію рабоча-сялянскай рэвалюцыйнай арміі, якая выбіла ўрадавае войска з шэрагу месц райёну. Горад Хайфун 3 лістапада быў заняты сялянамі. У Хайфуне ўтвораны пад кіраўніцтвам кампартыі рэвалюцыйны камітэт, які заклікае рабочых і сялян райёну паўстаць і ўтварыць рабочыя, сялянскія і салдацкія саветы.

ЗАБАСТОВАЧНЫ РУХ У ШАНХАІ.

ШАНХАЙ, 18-XI. Чужаземны друк зазначае, што ў Шанхаі бастуе 26 тысяч рабочых і што жоўтыя прафсаюзы ня могуць справіцца з рухам, якім „бязумоўна кіруе падпольны генэральны савет прафсаюзаў". Японская ўлада ўстанавілі варту японскіх фабрык японскімі маракамі, а кітайская ваенная ўлада разьмясьціла войска на японскіх і кітайскіх прадпрыёмствах, якія знаходзяцца на кітайскай тэрыторыі.

Сярод бастуючых раздаюцца камуністычныя лістоўкі з заклікам к барацьбе за павялічэньне зарплаты. Кітайскія ўлады Шанхаю ўжываюць выключныя меры супроць камуністаў, абшукваючы пешаходаў на вуліцах, гасьцініцы, арыштоўваючы дзесяткамі ўсіх «падазроных» асоб. Кітайскія ўлады, апрача таго, устанавілі агляд усіх прыходзячых у порт параходаў. Учора ў прамысловым цэнтры Шанхаю—у Путуне—кітайская паліцыя, разам з купецкімі дабрахвотнікамі, разагнала мітынг рабочых, ужыўшы зброю. Пры схватцы забіта двое рабочых. У Путуне абвешчана ваеннае становішча.

ПАДЗЕМНЫЯ ШТУРШКІ У КРЫМЕ.

СІМФЭРОПАЛЬ, 18-XI. У Ялце 16 лістапада ў 15 гадз. адчуваліся адзін за другім 4 падземныя штуршкі сілай у 3 балы. У будынках зьявіліся новыя трэшчыны.

АРЫШТЫ КАМУНІСТАЎ.

ПЕКІН, 17-XI. Перадаюць, што ў Цянцзіне на тэрыторыі ангельскае канцэсіі арыштован сэкратар камуністычнае кітайскае партыі Чэн-Чэ-Ян і камуністы Тан-Шао-Ен, Ін-Цзэ-Ін і Лі-Лян-Цен.

ТАН-ШЭН-ЧЫ УЦЁК У ЯПОНІЮ.

ТОКІЁ, 16-XI. Водлуг неправераных чутак, Тан Шэн-чы прыбыў у Куюшу, адкуль накіруецца ў Бэпу (Японія).

Парлямантары-хабарнік.

ПРАГА. Выкрыты злоўжываньні дэпутата аграрнае партыі Дубіцкага, які, будучы членам камітэту па правядзеньні зямельнае рэформы, за хабары раздаваў багатым сялянам лепшыя вучасткі.

Вялізны матар'ял, які выкрывае дзейнасьць Дубіцкага, сабраны сацыял-дэмакратычным дэпутатам Рэмешам. Дубіцкі не адхіляе хабарніцтва, але заяўляе, што ён браў не для сябе, а для партыі.

За дзень.

Абвостраньне франка-італьянскіх дачыненьняў

Некалькі дзён таму назад у Парыжы быў падпісан угавор аб прыязьні і арбітражы між Францыяй і Югаславіяй. Падпісаньне гэтага ўгавору яўляе сабою падзею вялізнае важнасьці. Але не таму, што падобная згода дапамагае справе міру, а наадварот, што яна выклікае за сабою абвастраньне і магчымасьць адкрытых стычак між капіталістычнымі дзяржавамі. Сутнасьць гэтага ўгавору ў тым, што французкая буржуазея пераходзіць у контр-наступленьне проці італьянскага імпэрыялізму.

Падпісаны і агалошаны ўгавор мае амаль двухгадовае існаваньне. І калі ён агалошан уласна зараз, то гэта сьведчыць аб новай, яшчэ больш абвостранай фазе ў франка-італьянскіх дачыненьнях.

Каб гэта стала зразумелым, трэба ўспомніць хоць-бы асноўныя этапы франка-італьянскіх узаемаадносін за апошні час. Італьянскі і фашысцкі друк ужо доўгі час вядзе заядлую кампанію проці Францыі. На італа-французкай мяжы ня раз мелі месца дробныя стычкі, якія характэрызавалі ўсю напружанасьць атмасфэры. Таксама памятна яшчэ правакатарская дзейнасьць агэнта Мусаліні, унука Гарыбальдзі, які спрабаваў абвастрыць франка-гішпанскія дачыненьні. Лік фактаў можна было-б яшчэ больш павялічыць. Якая-ж аснова гэтых канфліктаў?

Гутарка ідзе аб барацьбе між Францыяй і Італіяй за калёніі ў басэйне Міжземнага мора. Італьянскі імпэрыялізм лічыць сябе «абмінутым» Вэрсальскім угаворам і ўсяляк дамагаецца атрыманьня шэрагу калёній, як Сірыю (у Азіі), Туніс (у Паўночнай Афрыцы) і інш. За апошні час італьянскі імпэрыялізм вядзе наступ і ў пытаньні аб Танжэры. Танжэр—невялікі пункт каля Гібралтарскае пратокі, з прычыны свайго асабліва важнага стратэгічнага становішча, зьяўляецца даўнейшым аб'ектам спрэчак усіх сусьветных дзяржаў. Гадоў 20 таму назад пытаньне было вырашана ў тым сэнсе, што Танжэр быў абвешчан інтэрнацыянальнай зонаю, якая кіравалася ўсімі буйнымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі, у лік якіх Італія, аднак, не ўваходзіла. Цяпер фашысцкі імпэрыялізм дамагаецца ўваходу Італіі ў лік гэтых дзяржаў. Свае пратэнзіі Італія нядаўна выказала ў нядвусэнсным выглядзе: цэлая эскадра італьянскага вайсковага флёту пад камандаю стрэчнага брата італьянскага караля-прынца Удзіно дэманстрацыйна паявілася ў водах Танжэра.

Інтарэсы Італіі і Францыі спатыкаюцца і ў другім пункце. На Балканах Італія выяўляе ўсё большую і большую актыўнасьць, імкнучыся выцесьніць адтуль французкі ўплыў.

Італьянскі друк імкнецца праглынуць гэтую горкую пілюлю з вясёлым тварам. Усё-ж фашысцкія газэты ніяк ня могуць схаваць сваёй трывогі з прычыны гэтае згоды, бо для італьянскага імпэрыялізму падпісаньне франка-югаслаўскага ўгавору азначае новую, яшчэ больш абвостраную фазу італа-французкага супраціўніцтва.

Такім чынам, робіцца зусім відавочным, што франка-югаслаўская згода, хоць і гаворыць аб «прыязьні» і «арбітражы», у сапраўднасьці яўляе сабою новы асяродак ваенных стычак між дзьвюма буйнейшымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі.

Крэсавыя абшарнікі заварушыліся.

З лёгкай рукі польскіх «сапатараў», якія кінуліся арганізоўваць польскіх абшарнікаў і наогул кансэрватараў у самой Польшчы, заварушыліся і „крэсавыя" зубры. Ня так даўно ў Наваградку адбыліся два зьезды наваградзкіх абшарнікаў. На першай з гэтых нарад сабраліся дэлегаты павятовых аддзелаў крэсавага саюзу абшарнікаў Наваградзкага ваяводзтва і пастанавілі ўтварыць раду крэсавага саюзу абшарнікаў з паўнамоцтвамі ў справах калектыўных умоў з работнікамі, у справах падатковых і кантракту з ваяводзкімі ўладамі. Галоўным заданьнем гэтай рады, паводле «Слова», зьяўляецца рэпрэзэнтацыя абшарніцтва і сувязь з ваяводзкай адміністрацыяй.

Значна цікавейшай, аднак, была другая нарада абшарнікаў у Наваградку, на якой былі прысутнымі: ваявода Бэчковіч і стараста Грынеўскі. У сваёй прамове п. Бэчковіч сказаў, што ў сваёй працы ён разьлічае на супрацоўніцтва з абшарніцтвам. Між абшарніцтвам і ваяводзкімі ўладамі не павінна быць адсутуль ніякіх непаразуменьняў, а наадварот, цесная гарманічная споўпраца.

У адказ на гэта выступі

У Саюзе ССР.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАХОДУ НА 7 ГАДЗ. ДЗЕНЬ

Камісія ЎЦСПС.

МАСКВА, 17-XI. Прэзыдыум УЦСПС зацьвердзіў склад камісіі па пытаньнях правядзеньня 7-мігадзіннага рабочага дню ў ліку 13-ці чалавек.

Пераход на 7 гадзін працы ў Днепрапятроўску.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 17-XI. Распачата падрыхтоўчая праца да пераходу на 7-мігадзінны рабочы дзень на прадпрыёмствах паліграфічнае вытворчасьці. У першую чаргу на 7-мігадзінны рабочы дзень будзе пераведзена друкарня газэты «Звезда».

7-мігадзінны дзень у хімічнай прамысловасьці.

МАСКВА. Прэзыдыум МК саюзу хімікаў пастанавіў пачаць перамовы з Гумовым Трэстам аб увядзеньні 7-мігадзіннага дню ў тых галінах галёшнае вытворчасьці, дзе праца праводзіцца на падставе навуковае арганізацыі працы.

Далей прэзыдыум лічыць мэтазгодным паставіць пытаньне аб увядзеньні скарочанага дню ў першую чаргу на мэханізаваных, шкляных і запалкавых прадпрыёмствах.

ДЭКЛЯРАЦЫЯ 3-е НЯМЕЦКАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ.

МАСКВА, 17-XI. 3-я нямецкая рабочая дэлегацыя перад выездам з СССР перадала ЎЦСПС дэкларацыю да пралетарыяту Масквы, да ўсіх працоўных СССР і Чырвонае арміі.

— Справа абароны Савецкага Саюзу і яго сацыялістычнага будаўніцтва,—гаворыцца ў дэкларацыі,—павінна стаць справаю сусьветнага пралетарыяту. Самую моцную гарантыю проці новых імпэрыялістычных нападаў на СССР мы бачым у заснаваньні адзінага прафсаюзнага Інтэрнацыяналу. Удзельнікі дэлегацыі клянуцца змагацца за аднаўленьне міжнароднага прафсаюзнага адзінства.

Пралетарскія пісьменьнікі на абароне СССР.

МАСКВА. Міжнародная канфэрэнцыя пралетарскіх рэвалюцыйных пісьменьнікаў пасьля прапановы Станге («Польшча) ўхваліла рэзалюцыю проці імпэрыялістычнай вайны. Канфэрэнцыя лічыць, што вышэйшы абавязак пралетарскіх і рэвалюцыйных пісьменьнікаў у даны момант, гэта ёсьць барацьба адзіным фронтам пісьменьнікаў усіх краёў проці імпэрыялізму, за кітайскую рэвалюцыю, а таксама за Савецкі Саюз.

Міжнародная дэлегацыя культурнікаў.

ХАРКАЎ, 17-XI. У Харкаў прыехала з Масквы міжнародная дэлегацыя прадстаўнікоў навукі, літаратуры і мастацтва ў ліку 17-ці чалавек. У склад дэлегацыі ўваходзяць прадстаўнікі Нямеччыны, Сэрбіі, Японіі, Швэцыі, Нарвэгіі і Аргентыны. А ліку дэлегатаў—выдатны румынскі пісьменьнік Панаіто Істраты, нямецкая пісьменьніца Штэкер, нямецкі журналіст Холічар, японскі пісьменьнік Акіта і інш.

Дэлегацыю сустракалі прадстаўнікі НКАсьветы Украіны, літаратурных арганізацый і сэкцый навуковых працаўнікоў і друку.

У адказе на прывітаньні прафэсар Токійскага унівэрсытэту Онэкао сказаў: «Японская грамадзкасьць ведае Украіну па творах Шэўчэнкі і Гогаля. Украінская культура карыстаецца ў Японіі вялікімі сымпатыямі. Мы ўпэўнены, што вы будзеце мець новую перамогу ва ўсіх галінах культурнага будаўніцтва".

Пазыка індустрыялізацыі рэалізавана з лішкам.

МАСКВА, 17-11. У Маскве, Ленінградзе і Харкаве да 14 лістапада і ў іншых гарадох Саюзу да 1 лістапада агульная сума падпіскі на пазыку індустрыялізацыі складае 192600 тысяч руб. Наўлічаная сума рэалізацыі па Саюзе з 1 лістапада, бязумоўна, перавысіць нерэалізаваную рэштку, і падпіска на пазыку перавысіць выпуск яе.

Камсамол Украіны на змаганьні з бяспрытульнасьцю.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 17-Xi. Камсамольскі суботнік у Днепрапятроўску даў звыш 30 тысяч руб. на ліквідацыю дзіцячае бяспрытульнасьці. З вуліц ужо дадзен прытулак 300 бяспрытульным.

АРЦЁМАЎСК. 17-XI. Камсамольскі суботнік даў па акрузе 26 тыс. руб. У суботніку брала ўдзел 24.418 чал. У працы бяруць удзел камсамольцы, беспартыйная моладзь, старыя рабочыя, адміністрацыя прадпрыёмстваў і інжэнэрна-тэхнічны пэрсанал.

Мінэральныя багацьці сібірскіх вазёр.

НОВАСІБІРСК. Савет народнае гаспадаркі сібірскага краю правёў абсьледаваньне Пятухоўскіх і Міхайлаўскіх вазёр Слаўгародзкае акругі, якое дало вялікія вынікі. Вынулена, што запасы соды ў гэтым райёне дасягаюць 14 міліёнаў тон сыравіны, з магчымым штогодным здобычам кальцыната да 260 тысяч тон. Запасы хлёрыстага натра вызначаны ў 950 міліёнаў пудоў штогодны здобыч вызначаецца ў 47 міліёнаў пудоў, прычым да міліёну пудоў высокагатунковае солі, годнае для масла.

Запасы сернакіслых соляў у вазёрах Слаўгародзкае акругі вылічаюцца дзесяткамі міліярдаў пудоў. Маюцца таксама значныя запасы соляў магнія.

З правядзеньнем Сібірска-Сямірэчынскае чыгункі і некалькіх падвязных калёін высоўваецца на чаргу магчымасьць эксплёатацыі гэтых багацьцяў. Вынікі абсьледаваньня падаюцца ў Дзяржплян.

Прыгоды „Вацлава Вароўскага" заграніцаю.

АДЭСА, 17-XI. Сёньня прыехаў з Уладывастоку параход «Вацлаў Вароўскі», даставіўшы з Шанхаю звыш 1500 тон гарбаты. Параход падпаў у Шанхаі ўважліваму вобыску ангельскае мытнае паліцыі, сярод якое было шмат белагвардзейцаў. Паліцэйскія шукалі праклямацый і зброі.

У галяндзкім порце Сабанг «Вацлаў Вароўскі» быў абкружан мясцовую паліцыяю, якая ні на хвіліну не пакідала савецкую каманду. У Суэцы навакол параходу была пастаўлена варта. Маракам было забаронена выйсьці на бераг.

Кастрычнік і мастацкая літаратура на Ўсходзе.

Сучасны савецкі бытапісец Усходу падыйшоў да ўсходняй сапраўднасьці, калі старая традыцыя ў галіне апісаньня Ўсходу была здадзена безвяротна ў схову.

Пасьлякастрычнікавы пэрыяд расейскай мастацкай літаратуры аб Усходзе распачаўся маленькімі апавяданьнямі, вершамі. Гэта былі першыя храсткі і сярод іх „Туркестанскія калёніяльныя апавяданьні"—кволыя па форме і з нядзікавым зьместам—крыху напомнілі пра калёніяльны быт у ранейшых акраінах царскай Расеі. Гэтыя апавяданьні нічога супольнага ня маюць з тэю літаратураю, якая вырасла на Захадзе; тут ня было фольклёру, этнаграфіі і ідэалёгіі герояў. Гэты тып усходняй бэлетрыстыкі ня мог, зразумела, разьвіцца ў нас, бо пасьлякастрычнікавы пэрыяд адабраў у яе глебу—перад ёю ўжо ня было калёніяльнага „матар'ялу". Замест гэтага матар'ялу перад нашымі пісьменьнікамі паўстала задача, якой заходня-эўрапейскі бэлетрыст не разумее, адбіць новы складамы працэс на ўсіх узаемаадносінах быту і жыцьця ўсходніх народаў.

Першая сур'ёзная спроба даць матар'ял для разуменьня варункаў быту савецкага Ўсходу была зроблена Фурманавым у яго «Мятэжы». Фурманаў задумаў шэраг усходніх фігур і тыпаў, якіх, аднак, не пасьпеў даць. Але і тое, што ён даў, сьведчыць, што ў галіне апісаньня Ўсходу ў яго было значна больш мастацкай магчымасьці і прадумванасьці, чымся ў іншых сучасных бытапісцаў Ўсходу. Ён здолеў выявіць на фоне складаных нацыянальных узаемаадносін найбольш характэрныя рысы кіргіскага жыцьця, заўважыць і мастацкі аформіць шэраг цікавых момантаў з гэтай сапраўднасьці ў пэрыяд грамадзянскай вайны і падрыхтаваць гэтым базу для будучай сацыяльнай аповесьці. І сапраўды, пры аглядзе сучаснай бэлетрыстыкі, прысьвечанай Усходу, можна ўжо сьцьвердзіць, што ў гэтай галіне вырастаюць мастацкія творы, якія ідуць, можна сказаць, ад Фурманава.

Мастацкая бэлетрыстыка і шэраг поўмастацкіх апавяданьняў, прысьвечаных Усходу, ужо адбілі ня толькі новыя ўмовы і створаныя пасьля Кастрычніка міжклясавыя і міжнацыянальныя ўзаемаадносіны, але і ў значнай меры падрыхтавалі матар'ял для выяўленьня новых тыпаў, новых фігур. У шмат якіх творах мы бачым, як у агні грамадзянскай вайны і далей новага будаўніцтва на мясцох вырасталі новыя людзі, аджывалі прадстаўнікі старога быту або зьменьвалі «вехі». Гэты бок асабліва вылучан у рамане армянскага пісьменьніка Чарэнца „Страна Напри". Тое-ж самае ў поўбэлетрыстычных апавяданьнях Гатуева „Інгушэтыя".

Уся гэта літаратура ў тэй ці іншай меры паказала крызіс і рост нацыянальнай самасьвядомасьці і культурных дасягненьняў на нашым Усходзе. У ёй адбіваецца паступовы пераход ад старых форм да новых, самае нараджэньне новых культурных сіл, якія выбіліся з путаў старога ладу, взялі да Кастрычніка барацьбу з цэраю ва ўмовах родавага быту («Мудрецкий сын" Амур Савана).

Ня менш важным зьяўленьнем і тое новае асьвятленьне, якое дадзена ў сучасны момант у мастацкай літаратуры, прысьвечанай Усходу, складанаму пытаньню жыцьця горцаў—абрэцтву.

Матар'ял, на якім быў пабудаван „Хаджы-Мурат" Талстога, зараз значна папыран і абноўлен. Зялімханаўшчына, як бытавое зьявішча ў царскай „Расеі", набывае новае асьвятленьне, якое павінна быць выкарыстана для стварэньня адпаведнай сацыяльнай аповесьці.

І мастацкая літаратура нацыянальнасьцяў усходніх рэспублік таксама значна вырасла і высунула шэраг пралетарскіх пісьменьнікаў, якія запісваюць усё тое новае, што зьявілася ў жыцьці ўсходніх народаў пасьля Кастрычніка. Зьяўляюцца літаратурна-мастацкія нізкі, у якіх адбіты ня толькі моманты сацыяльнага і культурнага абнаўленьня, але і факты савецкага будаўніцтва: электрыфікацыя, мэліярацыя. І ў гэтым кароткім агляндзе нельга не памянуць, што шмат з якіх узорах мастацкай працы і паэзіі ўсходніх народаў Саюзу галоўным момантам зьяўляецца ідэя нацыянальнага братэрства, аб'ядваньне ўсяго працоўнага чалавецтва. Гэта думка асабліва выразна надкрэслена ў паэме армянскага паэты Азата Ўштуні „Рам Рой".

Найбольшую яскравасьць выяўляе творчасьць усходніх народаў Саюзу, якія стварылі надзвычайна цікаўныя ўзоры, сымбалізуючыя ўсю магутнасьць Кастрычнікавай рэвалюцыі, як галоўнага моманту ў іх адраджэньні. Сабраны Л. Салаўёвым у кішлаках Сярэдняй Азіі і зьмешчаны ім пакуль што асобнымі адрыўкамі ў розных выданьнях матар'ял выяўляе, пераважна, адносіны ўсходняга сялянства да Леніна. Народны эпас ў сьпевах узьбекаў, сказаньнях кіргізаў, лягендах таджыкаў увасабіў у Леніне ўсю мару аб новым жыцьці. Ленін стаў лягендарнаю асобаю, з якою народная гутарка зьвязала ўсе свае разуменьні аб шчасьці, бо «імя яго будзе жыць, пакуль жыве слова шчасьце».

„Таполь толькі тады можа ўзьняць верхавіну сваю вышэй гор—
Калі карэньням яго будзе давоі вады.
Бархан толькі тады можа напоўніць сабою мора—
Калі ён будзе велічынёю з уде горы Паміру.
Адзін чалавек толькі тады можа прымусіць гаварыць пра сябе ўвесь сьвет—
Калі ён учыніць або начуванае злачынства
Або зробіць добрую справу для ўсяго сьвету.
Ад многіх злачынстваў калацілася зямля.
І пра многія, з гэтае прычыны, гаварыў сьвет.
Добрыя-ж справы тварылі нямногія.
Але самую вялікую добрую справу зрабіў Ленін—
Вызваленца, зямная пасудзіна дабрачыннасьці"...

Падобны-ж матар'ял, які выяўляе адносіны ўсходніх народаў Саюзу да Кастрычніка, вырас ужо і ў іншых нашых рэспубліках, але ён ня атрымаў яшчэ належнага афармленьня і чакае распрацоўкі.

Ю. В.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Ахова здароўя.

Мазыр. Паводле пляну работы акруговай інспэкцыі аховы здароўя мяркуецца правесьці ў 1927-28 годзе шэраг мерапрыёмстваў па разьвіцьці мэдычнай справы ў акрузе.

Так, у галіне лекава-прафілактычнай работы мяркуецца зрабіць наступнае: дабудаваць у г. Мазыры цэнтральную рабочую амбуляторыю, дабудаваць і абсталяваць больніцы ў Жыткавічах і Капаткевічах, абсталяваць Юравіцную больніцу, арганізаваць нэрвова-паталёгічны габінэт, адчыніць вэнэрычны дыспансэр.

Для палепшаньня якасьці мэдычнай дапамогі прыняць меры да замены малакваліфікаванага мэдычнага пэрсаралу больш кваліфікаванымі працаўнікамі, а таксама больш рацыянальна скарыстоўваць дактароў у сэнсе поўнай нагрузкі і імкнуцца да зьнішчэньня частай перакідкі іх з аднае ўстановы ў другую.

У тых раёнах, дзе не арганізаваны, арганізаваць зубалекавую дапамогу. У горадзе Мазыры адчыніць дзіцячую пляцоўку з дыэтычным харчаваньнем. Адчыніць начны сухогны санаторый.

Для барацьбы з эпідэміямі ў акрузе прыняць меры для здавальненьня лекавых устаноў належнымі мэдыкамэнтамі, а таксама абсталяваць у райённых больніцах заразныя баракі, абсьледаваць веску Радзівілавічы, Тураўскага раёну, з мэтаю выяўленьня бытавога сыфілісу, абсьледаваць санітарнае становішча рабочых пасёлкаў, заводаў і фабрык, а таксама па 2 вёскі ў кожным райёне, 10 мястэчак і горад Мазыр, правесьці кампанію па барацьбе з малярыяй, распрацаваць цыкл лекцый па санітарыі, розных хваробах і г. д.

У галіне аховы мацеры і дзіцяці мяркуецца арганізаваць кансультацыю для дзяцей і цяжарных у горадзе Пятрыкове, адчыніць 20 палявых ясьляў і прыняць меры да ўцягненьня грамадзкіх арганізацый і самога насьленьня ў адчыненьні дадатковых ясьляў, пашырыць ясьлі ў горадзе Мазыры, папулярызаваць дзейнасьць «Ахматмладу» сярод насьленьня праз чытку лекцый і экскурсіі і г. д.

Для падрыхтоўкі працайнікоў дзіцячых ясьляў арганізаваць месячныя курсы, правесьці выпуск курсаў мэдычных сясьцёр, арганізаваць курсы перападрыхтоўкі акушорак, а таксама прыняць меры да ўкамплектаваньня райённых лекавых устаноў мэдыцынскім пэрсаналам.

У 1927-28 годзе мяркуецца таксама правесьці шэраг мерапрыёмстваў у галіне школьна-санітарнай работы, а таксама аптэчнай справы ў акрузе і ў галіне рабочай мэдыцыны.

М.

ПАДЗЕЖ ЖЫВЁЛЫ.

Віцебск, 18-11. На акрузе за апошні час наглядаецца значны падзеж буйнае рагатае жывёлы і коняй. Па адным толькі Віцебскім райёне за кастрычнік пала ад розных хвароб 105 галоў жывёлы. АВК прапанаваў усім райвыканкомам зьвярнуць увагу на своечасовае складаньне актаў аб падзяжы жывёлы.

РОСТ ПРАЦОЎНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ.

Віцебск, 18-11. Зараз у акрузе налічваецца 28 працоўных калектываў, у якіх занята 868 рабочых. Управа працоўнымі калектывамі адчыніла сталоўку, у якой занята 7 чалавек.

САМАТУЖНА-ПРАМЫСЛОВАЯ КААПЭРАЦЫЯ.

Віцебск, 18-11. У 1927-28 г. саматужна-прамысловая каапэрацыя мае на мэце павялічыць сваю сетку на 12 проц., прычым асаблівая ўвага будзе зьвернута на каапэраваньне вёскі, жанчын, моладзі і мястачковых саматужнікаў. Апрача таго, будуць значна пашыраны вытворчыя арцелі, ужо існуючыя, якія працуюць на мясцовай сырызьне.

УЗБУЙНЕНЬНЕ СЕЛЬСАВЕТАЎ.

Гомель, 17-11. Акрыпянам пры ўдзеле арганізацыйнага аддзелу АВК распрацаваны праэкт узбуйненьня сельсаветаў акругі. Па новаму праэкту намячаецца: у Брагінскім райёне—20 сельсаветаў, Хойніцкім—22, Камарынскім—13, Лоеўскім—15, Рэчыцкім—41, Гомельскім—32, Уваравіцкім—21, Чачэрскім — 24, Веткаўскім—31, Церахоўскім—21.

ВЯЧЭРНІ РАБФАК.

Гомель, 17-11. Камісія па камплектаваньню вячэрняга рабфаку скончыла 15 лістапада разгляд заяваў. Усяго паступіла 300 заяў. Прыняты на рабфак 71 чалавек. Заняткі пачынаюцца 18 лістапада.

КУРСЫ ПА ПРАЦОЎНАМУ ЗАКОНАДАЎСТВУ.

Гомель, 14-11. Саюз савецкіх і гандлёвых служачых арганізаваў курсы па працоўнаму законадаўству. На курсах навучаецца 50 чал.

102.666 ПІСЬМЕННЫХ.

Ворша, 18-XI. На акрузе за мінулыя гады ліквідавала няпісьменнасьць і малапісьменнасьць 102.666 чалавек дарослых. Праца па зьнішчэньні няпісьменнасьці напружаным тэмпам ідзе далей пры шырокім удзеле самога грамадзянства.

ЗАГАТОЎКА ПУШНІНЫ.

Бабруйск, 18-XI. Саюз паляўнічых пачаў загатоўку пушніны. Сельска-гаспадарчы банк адпушчае для гэтай мэты крэдыту ў 4.500 руб. Усяго намеркавана загатовіць пушніны на 18.000 руб. З мэтай палепшэньня якасьці пушніны склікаюцца сходы паляўнічых, на якіх будзе абмяркована пытаньне аб захаваньні і дастаўцы на загатоўчыя пункты пушніны.

КРЭДЫТ НА МАШЫНЫ І ПЕРАСЯЛЕНЬНЕ.

Бабруйск, 18-XI. Акруговы сельска-гаспадарчага банк атрымаў крэдыт у 13.000 руб. на сельска-гаспадарчыя машыны і 15.000 руб. на ўнутрысяленнае перасяленьне.

ДАПАМОГА КРЫМУ.

Бабруйск 18-XI. Прэзыдыум АВК асигнаваў 200 руб. у фонд дапамогі пацярпеўшым ад землятрасеньня ў Крыме. Апрача гэтага, арганізоўваецца збор сярод грамадзкіх, гаспадарчых і прафесыянальных устаноў і арганізацыяў на карысьць пацярпеўшых.

НА БУДАЎНІЦТВЕ КАМБІНАТУ.

Бабруйск, 18-9. Белдзяржстрой скончыў працу на вывядзеньню сьцен корпусу фанэрнага заводу. Гэты завод уваходзіць у сыстэму будуючагася буйнага камбінату. У зімовы час будуць весьціся працы па перакрыцьцю, а таксама і сталярныя.

РОСТ С.-ГАСП. КРЭДЫТНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Барысаў, 18-9. У Барысаўскім райёне маецца толькі адно с-гасп. крэдытнае таварыства, якое з кожным годам буйна расьце. Так, у 1925-26 г. было 1040 пайшчыкаў, у 1926-27 г. —1610 і зараз налічваецца 2016 пайшчыкаў. Паявы капітал з 3942 р. павялічыўся да 9069 руб.

VI Партканфэрэнцыя Менскай акругі.

Праца ЦКК НК РСІ.

(З дакладу тав. Калініна).

На працягу апошняга году аднэй з галоўных задач у працы ЦКК РСІ стаяла пытаньне аб паляпшэньні дзяржаўнага апарату.

Гэта пытаньне заняло прыблізна 30 проц. усёй нашай працы.

Другім важным пытаньнем было—паскарэньне тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва і правільнае скарыстаньне сродкаў, якія адпускаюцца на гэту мэту.

3-е грунтоўнае пытаньне—барацьба з бюракратызмам і недахопамі дзяржаўнага апарату.

4. Барацьба за адзінства партыі і з адмоўнымі зьявішчамі ў ёй.

Вось тыя чатыры галоўныя пытаньні, якімі былі ў прыватнасьці заняты ЦКК-РСІ.

Умовы працы.

Працаваць прыходзілася часамі ў няспрыяючых умовах. Былі выпадкі, калі тая ці іншая ўстанова адносілася пасыўна да мерапрыёмств і наогул імкнулася стварыць дрэнныя абставіны. Напрыклад, Наркамгандлю на прапанову перагледзець структуру апарату і даць плян рэарганізацыі, склаў такі плян, па якому трэба было не скарачаць штат, а павялічаць. Дзяржбанк заявіў—ёсьць інспэктура РСІ, няхай яна плян рэарганізацыі сама складае.

Праўда, былі выпадкі, калі ўстановы і наркаматы ішлі нам на спатканьне і многа ў нашай працы дапамаглі.

Сувязь з масамі і уцягненьне іх у працу ЦКК-РСІ.

У гэтым напрамку зроблена многа. ЦКК-РСІ зрабіла 291 справаздачу перад рабочымі і акруговыя камісіі 283 справаздачы.

Мы лічым, што, чым больш сувязі з масамі, тым праца будзе карысьней. Таму не абмежаваліся справаздачамі перад рабочымі ў горадзе, а перанесьлі іх на вёску, адчытваліся перад сялянствам.

Мелі досыць сталую сувязь праз друк:

— За гэты час у газэтах было надрукавана 432 артыкулы.

Скарысталі рабкораў. Далі ім патрэбны напрамак, і яны многа дапамаглі.

Па іх заметках зроблена цэнтральным апаратам 150 дасьледваньняў і акруговымі камісіямі 250 дасьледваньняў.

У пракуратуру перададзена 174 карэспандэнцыі.

Прымалі ўдзел у працы па спрашчэньню і рэарганізацыі апарату эканомкамісіі, кам'ячэйкі, вытворчыя нарады і праф'ячэйкі пры прадпрыёмствах. Усяго прымала ўдзел у працы па прадпрыёмствах і ўстановах Беларусі 1200 чалавек.

Рэарганізацыя апарату.

У аснову рэарганізацыі было пакладзена—спрашчэньне, ліквідацыя раўналежнасьці функцый, перагляд узаемадносін паміж установамі вышэйшымі і ніжэйшымі, спрашчэньне справаздачнасьці, палепшаньне якасьці працы і гэтак д.

Мы перайшлі на інспэктарскую сыстэму, і думаем, што праца палепшыцца.

Ці былі памылкі ў нашай працы? Вельмі магчыма, што былі, але калі і былі, дык у бок перавялічэньня апарату, а ня ў бок залішняга зьменшэньня.

З новага году мы пачнём праверку працы устаноў, пераведзеных на новую сыстэму. Усе хібы вывучым і выправім.

Рэарганізацыя дзяржапарату па дзяржаўнаму і мясцоваму бюджэту агулам дала эканоміі 2240000 рублёў.

Калі дадаць сюды эканомію па спрашчэньню гаспадарчых устаноў у 2000000, то мы маем эканоміі больш 4 мільёнаў рублёў.

Спрашчэньне справаздачнасьці.

Тут мы маем такія вынікі: па сельсаветах было 34 формы з 16 тысячамі з лішкам пытаньняў, пакінулі адну форму—скарацілі на 80 проц. па райвыканкомах было 35 форм, пакінулі адну—скарацілі на 87 проц.; па камісарыяту асьветы справаздачнасьць скарацілі на 90 проц. і па камісіі аховы здароўя на 94 процанты і г. д.

Адным словам, раней па ўстановах быў акіян форм з астранамічнымі лічбамі пытаньняў—па ўсіх установах разам запаўнялася 37.556.000 пытаньняў.

Рэарганізацыя ў прамысловасьці.

Тут нам многа дапамаглі эканомкамісіі, кам'ячэйкі і праф'ячэйкі.

Скарочана многа розных прадстаўніцтваў і па магчымасьці штаты.

Па прамысловасьці ў зьвязку з рэарганізацыяй маем эканоміі 1163000 рублёў.

У гэтай галіне яшчэ праца ня скончана і мы яе праводзім далей.

Рэжым эканоміі і скарачэньне адміністрацыйных выдаткаў.

Нам была дадзена дырэктыва ЦК скараціць па ўсіх установах адміністрацыйныя выдаткі на 20 проц.

Па бюджэту дзяржаўнаму гэта дырэктыва выканана. Па мясцоваму бюджэту знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі.

Гэта мерапрыёмства нам дасьць каля 1.700.000 рублёў.

У гаспадарчых установах справа стаіць трошкі горш, але і тут мы дабіліся выкананьня дырэктывы партыі.

На прадпрыёмствах справа стаіць больш складана. Тут неабходна таксама скараціць выдаткі і такім чынам утаньніць прадукцыю на 6 проц.

Зьніжэньне цэн.

Зьніжэньне цэн за мінулы час адбылося ў сярэднім на 10 проц. на прамысловыя тавары.

Трэба адзначыць, што гэта зьніжэньне рабілася за кошт прыбытку.

Барацьба з бюракратызмам і праца бюро скаргаў.

Некалькі прыкладаў бюракратызму нашых устаноў.

Сельска-Гаспадарчая Акадэмія пастанавіла пабудаваць уборную і вось для гэтае мэты ўтварыла камісію ў складзе 4-х прафэсараў і аднаго інжэнэра.

І многа іншых малюнкаў, накшталт гэтага, можна назіраць у працы нашых устаноў.

Былі ў нас і такія ўстановы, якія выяўлялі з сябе нібы сямейныя камуны (ЦСУ).

Праз цэнтральны апарат ЦКК РСІ пакарана за справаздачны пэрыяд 192 тав., з іх за безгаспадарчасьць 61 чал., за пратэкцыянізм 13, за бюракратызм, валакіту і г. д.

У працу бюро скаргаў уцягваліся рабочыя і сяляне, дзеля чаго справы часта разьбіраліся на мясцох шляхам выездаў.

За справаздачны пэрыяд разгледжана бюро скаргаў 800 заяў.

Спрэчкі.

У спрэчках усе выступаўшыя адзначалі, што дасягненьні ў працы ЦКК РСІ вельмі значныя.

Надалей працу трэба яшчэ больш пашырыць і сыстэматычна вывучаць усе яе недахопы і своячасова зьнішчаць іх.

Прамоўцы зазначалі, што дрэнна яшчэ пастаўлена праца ў лясьніцтвах, трэба яе наладзіць.

Заключнае слова тав. Калініна.

Некаторыя таварышы запытвалі ў мяне, на колькі скарочаны гандлёвыя прадстаўніцтвы і штат ЦКК РСІ.

Адказваю—праўстаўніцтвы скарочаны прыблізна на палову, штат ЦКК РСІ на 30 проц.

Усе тыя заўвагі, якія зроблены выступаўшымі таварышамі, будуць намі прыняты на ўвагу.

Прывітаньне канфэрэнцыі прадстаўнікамі Швэдзкай і Нямецкай кампартыі.

Тав. Адамсон; (рэдактар швэдзкай камуністычнай газэты).

Я вельмі рад, што мне як рэдактару акруговае камуністычнае газэты ў Швэдыі, удалося асабіста браць удзел і вітаць вашу канфэрэнцыю.

Перад маім выездам у Ленінград і Маскву для ўдзелу ў сьвяткаваньні 20-цігодзьдзя Кастрычніка, рабочыя Швэдыі прасілі мяне перадаць прывітаньне расейскім таварышом.

Сілы нашае партыі растуць. Калі ў 1924 годзе мы мелі 6.000 членаў, то да сучаснага моманту мы маем 15.000 членаў партыі. Але сымпатыі рабочае клясы куды шырэйшыя. У часе галасаваньня за нас пададзена 110.000 галасоў.

Гэты рост уплыву нашае партыі пацьвярджаецца таксама і ў гор. Гетэбордзе, дзе я працую. У 1922 г. за нас пры галасаванні ў гарадзкую раду было пададзена 2.000 галасоў і мы правялі ў гарадзкое самакіраўніцтва 3-х дэлегатаў. Цяпер мы атрымалі 7.000 галасоў і правялі 7 дэлегатаў.

Нашыя сілы выразна растуць. Паступова зьмяншаецца ўплыў сацыял-дэмакратыі, рабочыя масы ўсё больш і больш пераконваюцца, што сацыял-дэмакраты зьяўляюцца лёкаямі міжнароднага капіталізму.

Перадаю вам ад імя камуністаў і камсамольцаў чырвонае, таварыскае прывітаньне.

Ваша праца па будаўніцтву сацыялізму ўмацоўваецца. Я бачу вялізныя дасягненьні, я пераканаены, што гэтыя дасягненьні ўсё больш і больш павялічаюцца.

Няхай жыве СССР!

Няхай жыве ўсясьветны Саюз Савецкіх Рэспублік

Тав. Бэсьлер: (камандзір чырвоных франтавікоў гор. Лейпцыгу).

Тав. партыйцы. Ад імя камуністычнае партыі Нямеччыны, ад імя чырвоных франтавікоў Нямеччыны перадаю вам братэрскае баявое прывітаньне.

Вы сьвяткуеце 10-ю гадавіну Кастрычніка, дзякуючы існаваньню і кіраўніцтву камуністычнае партыі, дзякуючы існаваньню Камінтэрну.

Прыехаўшыя на сьвяткаваньне сацыял-дэмакраты і анархісты, асабіста пераканаліся, што дыктатура пралетарыяту зьяўляецца сапраўднаю ўладаю шырокіх пралетарскіх мас.

Я быў сьведкаю, як пад уражаньнем вялізарнай дэманстрацыі пралетарыяў і Чырвонай арміі Масквы ў дзень 7 лістапада сацыял-дэмакраты скрозь сон гаварылі рэвалюцыйныя лёзунгі і сьпявалі Інтэрнацыянал.

Сацыял-дэмакраты шчыра гаварылі на Чырвоным Пляцы ў Маскве лёзунгі «Няхай жыве Чырвоная армія», бо яны пераканаліся, што Чырвоная армія зьяўляецца абаронцай ня толькі працоўных СССР, але і абаронцай сусьветнага пралетарыяту.

Калі мы вернемся ў нашыя краіны, мы пераканаем тых, хто раней былі супроць нас, што толькі адзіным фронтам, баронячы СССР, нам удасца перамагчы капіталізм.

Няхай жыве агульная барацьба сусьветнага пралетарыяту!

Няхай жыве сусьветная перамога!

Адказнае прывітаньне канфэрэнцыі.

Ад імя канфэрэнцыі т. т. Адамсона і Бэсьлера вітаў т. Фёдараў.

Усе тыя дасягненьні, якія вы тут бачылі, мы маем дзякуючы напружанасьці сіл і волі саміх рабочых, пад кіраўніцтвам кампартыі.

У далейшай нашай працы яшчэ многа цяжкасьцяй, але мы іх пераможам і пабудуем сацыялізм.

Няхай жыве пралетарыят і брацкія нам камуністычныя партыі Нямеччыны і Швэдыі!

Няхай жыве моцны саюз працоўных СССР з працоўнымі ўсяго сьвету!

Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал.

Хроніка канфэрэнцыі.

На вячэрнім пасяджэньні канфэрэнцыя заслухала справаздачу тав. Акуліка аб працы бюро акругкому, садаклад акругкому КСМ і даклад рэвізійнай камісіі.

▣ Учора ў канцы вячэрняга пасяджэньня канфэрэнцыю віталі спэцыяльна прыехаўшыя дэлегацыі барысаўскіх фабрык: 1) шклянога заводу імя «Домбаля». 2) лесапільнага заводу Камінтэрн, 3) запалкавае фабрыкі «Камінтэрн», 4) гаркамбінату, 5) ад цьвіковай фабрыкі, 6) дражджавога заводу.

Для прывітаньня барысаўскіх рабочых канфэрэнцыяй вылучана дэлегацыя, якая выедзе на месца ў Барысаў.

Атрыманы таксама прывітальныя тэлеграмы ад бабруйскай і полацкай канфэрэнцый.

Ад жабрацкай праспалоснай вёскі—да культурнага пасёлку.

САВЕЦКАЯ ЎЛАДА ПЕРАДАЛА СЯЛЯНСТВУ БССР 1.854.000 ГЭКТ. ЗЯМЛІ БЫЛЫХ АБШАРНІКАЎ.—ДЛЯ ЗЬМЯКЧЭНЬНЯ МАЛАЗЯМЕЛЬНЯ СКЛАДЗЕН ЗАПАСНЫ ЗЯМЕЛЬНЫ ФОНД У 587.500 ГЭКТ.—ДА ГЭТАГА ЧАСУ НА ТЭРЫТОРЫІ БССР ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНА 2.605.000 ГЭКТ. ЗЯМЛІ.

Да Кастрычнікавай рэвалюцыі ў карыстаньні сялянства ў сучасных межах БССР знаходзілася 54,3 проц. усяго зямельнага пляцу; абшарніцкія землі складалі 38,5 проц., іншыя—7,2 проц. Прагнаўшы памешчыкаў і капіталістаў, савецкая ўлада перадала працоўнаму сялянству з былых абшарніцкіх маёнткаў 1.854.000 гэкт. зямлі. Зараз агульны пляц зямлі Савецкай Беларусі разьмяркоўваецца па карыстаньні наступным чынам: у працоўным карыстаньні сялянства і ў запасным фондзе—65,2 проц. (8.178.000 гэкт.), дзяржаўныя лясныя фонды—26 проц. (3.263.000 гэкт.) лясы мясцовага значэньня—3,9 проц. (492.000 гэкт.), дзяржаўная зямельная маёмасьць—савецкія гаспадаркі, аграпункты рыбныя гаспадаркі і інш.—3,2 проц. (400.000 гэкт.) і землі спэцыяльнага прызначэньня і гарадзкія—1,7 проц. (222.000 гэкт.).

Для лепшага выкарыстаньня ўсяго пляцу зямлі сельска-гаспадарчага прызначэньня савецкая ўлада праводзіць цэлы шэраг мерапрыёмстваў. Робіцца захады, каб праз земляўпарадкаваньне пастаравіць на моцны эканамічны грунт нашу дарэвалюцыйную жабрацкую, церасяласную вёску з 3-х палёвай сыстэмай карыстаньня.

З 1922 году зямельныя органы пачалі плянавую працу па ўпарадкаваньні зямель працоўнага карыстаньня дзеля зьнішчэньня міжвясковай заблытанасьці землякарыстаньня, унутрывясковага земляўпарадкаваньня і галоўным чынам гаспадарчага ўпарадкаваньня зямель (перавод на шматпольле, арганізацыя невялікіх пасёлкаў і інш). Але ў гэтай працы савецкая ўлада Беларусі мае вялікую перашкоду—надзвычайнае малазямельле. Каб зьменшыць яго і даць зямлю безьзямельным і малазямельным, в 1925 году вядзецца спэцыяльная работа па адшуканьні зямельнага фонду, які ўжо і складзен на пляц ў 587.500 гэктар. З мая 1925 году вядуцца работы па яго разьмеркаваньні і ўпарадкаваньні. На жаль, 109.500 гэкт. гэтага фонду могуць быць скарыстаны пасьля правядзеньня на іх карэннай мэліярацыі. Да гэтага часу канчаткова разьмяркована і ўпарадкавана 305.700 гэктар. на якіх да 1-га кастрычніка 1926 году выдзелена 9370 гаспадарак для безьзямельных і данадзелена 36.930 двароў малазямельных. За мінулы год меркавалі надзяліць 5550 безьзямельных двароў і данадзяліць 15.630 двароў малазямельных. Уся работа па землянадзяленьні выканана выключна за кошт дзяржавы, і на гэту справу з 1925 г. да 1-га кастрычніка 1927 году затрачана 484.540 ру

ЗАМЕЖНЫЯ ЭСПЭРАНТЫСТЫ Ў МЕНСКУ.

Учора раніцою ў Менск прыехала група дэлегатаў рабочых эспэрантыстых.

Перад самым ад'ездам з Масквы склад групы зьмяніўся: некаторыя таварышы паехалі дамоў праз Ленінград.

Прыехалі ў Менск: **Эйнар Адамсон**—рэдактар газэты «Vast—Swenska Kuriren», член ЦК КП Швэдыі; **Отто Бэсьсьлер**—камандзір XI атраду чырвоных франтавікоў Лейпцыгу; член Заходня-Саксонскага камітэту КПГ, загадчык прэс бюро SAT; **Г. Гэмпэль**—старшыня саюзу рабочых эспэрантыстых Нямеччыны—рабочы пераплётчык; **Рычард Лерынэр**—дырэктар-адміністратар SAT (саюзу рабочых эспэрантыстых адзінага фронту).

На вакзале дэлегатаў сустракалі прадстаўнікі Беларускага Бюро Міжнароднай Сувязі П. Кірюшын і Зьм. Сьнежка, эспэрантыстыя і АБВШ, якой дэлегаты вязуць сьцяг фашыстых.

Дэлегаты наведалі Беларускі Дзяржаўны Музэй, БД Бібліятэку, выстаўку нацменшасьцяў, рэдакцыі газэт і некалькі заводаў.

Увечары адбылася ў АБВШ перадача фашысцкага сьцягу ад імя сапрыхільнага АБВШ XI атраду чырвоных франтавікоў.

У клюбе «КІМ» адбыўся інтэрнацыянальны вечар, на якім выступалі дэлегаты.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам дэлегаты падзяліліся сваімі ўражаньнямі аб СССР.

— Я ўжо другі раз прыяжджаю ў Сав. Саюз,—кажа Э. Адамсон:—першы раз я быў на УІ усясьветным кангрэсе рабочых эспэрантыстых.

Цяпер я прыехаў у БССР—краіну, якая мяне вельмі цікавіць і з якой я даўно хацеў дакладней пазнаёміцца. У газэце, якую я рэдагую, вельмі часта зьмяшчаюцца лісты з Беларусі. У жніўні выйшаў спэцыяльны нумар, прысьвечаны БССР; у кастрычнікавым нумары зьмешчаны 3 артыкулы аб БССР і некалькі фото. Па звароце даноў мы пачнём рыхтаваць да друку брашуру аб Беларусі.

Культурная сувязь з БССР мяне вельмі цікавіць, і, як раней, я буду яе падтрымліваць.

СССР расьце і будуецца. Я быў у СССР 1 з паловай годы таму назад, і за гэты кароткі тэрмін я бачу шмат новага. Сацыялістычнае будаўніцтва ідзе вельмі шпарка.

Я зьдзіўся, як узрос культурна рабочы. Я быў на сходзе рабкораў «Правды»—і бачыў, як рабкоры актыўна прымаюць удзел у рабоце газэты. У нас пакуль што гэтага няма. Але мы ваш вопыт выкарыстаем у нас. Сувязь паміж рабкорамі розных краін і СССР мае вялікую каштоўнасьць, бо яна дапамагае нам вучыцца ў вас.

— Мой атрад,—кажа Д. Бэсьсьлер,—даручыў мне перадаць сапрыхільнай АБВШ фашыстаўскі сьцяг, адбіты чырвонымі франтавікамі ў адной схватцы з фашыстамі. Мы перадаём яго, як сымбаль таго, што мы са сваім «жалезным кулаком» без аружжа змагаемся з фашыстамі. Фашысты ня ведаюць, дзе гэты сьцяг. І калі даведаюцца, што іх сьцяг у СССР, будуць вельмі абураны.

Кангрэс прыцеляў СССР мае тым больш значэньне,—кажа Бэсьсьлер,—што ён дапаможа замежным рабочым сапраўды аб'яднацца навокал СССР. Гэты кангрэс узмацніць сувязь рабочых розных краін з СССР—бацькаўшчынай пралетарыяў усіх краін.

Рабочыя дэлегацыі, якія былі ў СССР і шмат якіх яшчэ засталося ў СССР—па звароце дамоў зьявяцца самымі лепшымі агітатарамі за СССР.

— Я першы раз у СССР, — кажа т. Гэмпэль,—і ў мяне столькі ўражаньняў ад яе, што я маю магчымасьці ў іх разабрацца. Адно я ўбачыў, што СССР—краіна, дзе ўлада належыць рабочым і сялянам. СССР—краіна пралетарская. Усё, што я бачыў, застанецца на ўсё жыцьцё ў памяці. Шмат чаго раскажу я ў Нямеччыне аб СССР. А калі будзе патрэбна, калі СССР будзе пагражаць вайна, мы сустрэнемся з вамі ў агульных шэрагах барацьбітоў за сусьветны Кастрычнік.

Зьлева направа: 1) ГЭМПЭЛЬ, 2) БЭСЬСЬЛЕР (камандзір атраду чырвоных франтавікоў), 3) ЛЕРИНЭР (усе тры з Нямеччыны) і 4) АДАМСОН—рэдактар швэдзкай камуністычнай газэты.

Беларуская вайсковая школа атрымала каштоўны трафэй.

Учора ў 7 гадзін вечара міжнародная дэлегацыя эспэрантыстаў наведалася ў Аб'яднаную Беларускую Вайсковую школу імя ЦВК БССР.

На ўрачыстым сходзе ўсіх курсантаў у клюбе школы т. Отто Бэсьсьлер—камандзір XI атраду нямецкіх чырвоных франтавікоў,—даручыў Аб'яднанай школе трафэй, дабыты атрадам у нямецкіх фашыстаў—фашысцкі сьцяг.

Падрабязнасьці ўрачыстага пасяджэньня будуць у наступным нумары нашай газэты.

У прэзыдыуме ЦВК БССР.

17 лістапада пад старшынствам тав. А. Хацкевіча адбылося чарговае пасяджэньне прэзыдыуму ЦВК БССР, на якім былі разгледжаны наступныя пытаньні:

АБ ПАРАДКУ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ ЎСТАНОЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ ГОМЕЛЬСКАЕ АКРУГІ.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў прадстаўлены Нацкамісіяй прэзыдыуму ЦВК БССР план беларусізацыі ўстаноў і арганізацый Гомельскае акругі.

Для поўнага ажыцьцяўленьня намечанага плану беларусізацыі вызначаны наступныя тэрміны:

Да першага лістапада 1928 г. поўнасьцю пераводзяць сваю працу на беларускую мову: акрвыканком, акрземаддзел, інспэктарыят народнае асьветы, пракуратура і судовыя ўстановы, адміністрацыйны аддзел АВК, райвыканкомы і саветы акругі.

Да першага лістапада 1929 году павінны беларусізавацца: інспэктарыят сацыяльнай забясьпекі, паштовая кантора і паштовыя аддзяленьні, акруговы інспэктарыят аховы здароўя, акрваенкамат, кааперацыйныя арганізацыі і ўсе іншыя савецкія ўстановы, якія знаходзяцца на тэрыторыі акругі.

У 3-хгадовы тэрмін канчаткова павінны беларусізавацца ўсе беларускія навучальныя ўстановы па сацыяльным выхаваньні, установы палітасьветы і прафасьветы.

РЭЗАЛЮЦЫЯ АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ ВЯРХОЎНАГА СУДУ БССР У 1926 ГОДЗЕ.

Заслухаўшы даклад тав. Варашылава аб дзейнасьці Вярхоўнага Суду БССР за справаздачны перыяд, прэзыдыум ЦВК БССР сьцьвярджае:

Дзейнасьць Вярхоўнага Суду за справаздачны перыяд прызнаць здавальняючай; узятую лінію ў галіне правядзеньня палітыкі па прымяненьні мер сацыяльнай абароны прызнаць правільнай і ў клясавых адносінах вытрыманай.

Прэзыдыум ЦВК адзначае, што асаблівыя палітычныя ўмовы БССР, як пагранічнае рэспублікі, у якой маюць месца надыходы клясавых ворагаў, якія выяўляюцца ў кіраўніцтве заграничнымі контр-рэвалюцыйнымі арганізацыямі шпіянажу, бандытызму і г. д., з аднаго боку, і разьвіцьця вытворчых сіл і грамадзянскага звароту ў краіне пры наліччы барацьбы паміж прыватным капіталам і сацыялістычнай гаспадаркай, з другога боку,—патрабавалі ад Вярхоўнага Суду асаблівай палітычнай гібкасьці ў абароне заваёў і ўстаноўленага рабоча-сялянскую ўладаю правапарадку. Вярхоўны Суд спраўіўся з гэтымі задачамі, аддаўшы ўсю сваю ўвагу абароне сацыялістычнае дзяржавы і ўкараненьню рэвалюцыйнай законнасьці ў масах.

Разам з гэтым прэзыдыум ЦВК адзначае наступныя недахопы ў дзейнасьці Вярхоўнага Суду.

Вярхоўны Суд недастарчальна правяў сабе, як Суд першай інстанцыі: ён мала зварочваў увагі на справы асаблівай дзяржаўнай важнасьці, якія мелі палітычнае і грамадзкае значэньне. Гэтыя справы прайшлі міма Вярхоўнага Суду, што на будучы час належыць выправіць, прымаючы да свайго справаводства і разгляду справы асаблівай дзяржаўнай важнасьці.

Вярхоўны Суд у сваёй кіруючай працы недастарчальна выкарыстоўваў тыя магчымасьці, якія меліся ў яго па кіраўніцтву акруговымі судамі праз абсьледаваньні, рэвізіі, інструкцыйныя лісты і тлумачэньне законаў ад імя пленуму Вярхоўнага Суду.

Праца ў гэтай галіне павінна быць паднята па належную вышыню.

У зьвязку з некаторай няясьнасьцю, што мае месца ў Палажэньні аб судаводстве, у адносінах кіраўніцтва судамі заўважаецца паралелізм у рабоце Вярхоўнага Суду і НКЮ. Дзеля гэтага прэзыдыуму ЦВК прапануе НКЮ разам з Вярхоўным Судом 2-хмесячны тэрмін распрацаваць праэкт мерапрыемстваў па разьмежаваньні функцый Вярхоўнага Суду і НКЮ.

Маруднасьць, якая заўважаецца ў нашых судох у разглядзе спраў, павінна быць зьнішчана праз спрашчэньне судовых працэсаў, дзеля чаго Прэзыдыум ЦВК прапануе НКЮ разам з Вярхоўным Судом распрацаваць адпаведныя мерапрыемствы.

На судовыя ўстановы ўскладзены задачы выхоўваць масы ў прававых адносінах. Аднак-жа гэтая праца з боку Вярхоўнага Суду ажыцьцяўлялася недавальняюча, і яму неабходна ў гэтых адносінах узманіць працу праз пастаноўку дакладаў і справаздач аб дзейнасьці судовых устаноў на рабочых і сялянскіх сходах.

АБ ПРАМЫСЛОВАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў унесены СНК БССР праэкт пастановы ЦВК і СНК аб прамысловай кааперацыі.

Рэгістрацыя прамысловых кааперацыйных таварыстваў (арцеляў), якія знаходзяцца ў межах сельскіх мясцовасьцей і мястечак, робіцца райённымі выканаўчымі камітэтамі; таварыствы і саюзы прамысловай кааперацыі акруговага маштабу рэгіструюцца інспэкцыямі мясцовае прамысловасьці АВК, а саюзы, якія ўваходзяць у т-вы розных округ, рэгіструюцца ў аддзеле мясцовай прамысловасьці ВСНГ БССР.

Прамысловыя кааперацыйныя т-вы і іх саюзы, якія не пачнуць сваёй дзейнасьці ў працягу трох месяцаў з моманту рэгістрацыі, лічацца не ажыцьцёўленымі.

Органамі кіраваньня прамысловага кааперацыйнага т-ва зьяўляюцца — агульны сход членаў т-ва і кіраўніцтва; органамі ўнутранай рэвізіі—рэвізійныя камісіі.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ ІНСПЭКЦЫІ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ АВК.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў унесены СНК праэкт пастановы ЦВК і СНК аб інспэкцыі мясцовай прамысловасьці акруговых выканаўчых камітэтаў.

Для беспасрэднага кіраваньня мясцовай прамысловасьцю і нагляду за яе дзейнасьцю ўтвараюцца ў складзе акруговых выканаўчых камітэтаў інспэкцыі мясцовае прамысловасьці, на якія ўскладаюцца: складаньне вытворча-фінансавых плянаў мясцовае дзяржаўнае прамысловасьці на округах, распрацоўка акруговых плянаў крэдытаваньня прадпрыемстваў мясцовае дзяржаўнае прамысловасьці і інш.

Інспэкцыі мясцовае прамысловасьці падпарадкоўваюць АВК і ажыцьцяўляюць у сваёй дзейнасьці дырэктывы акруговых выканаўчых камітэтатаў і ВСНГ БССР.

АБ АДДЗЕЛЕ МЯСЦОВАЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ВСНГ БССР.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў унесены СНК праэкт пастановы ЦВК і СНК аб аддзеле мясцовай прамысловасьці ВСНГ БССР. У складзе ВСНГ утвараецца Аддзел Мясцовае Прамысловасьці. Саматужная секцыя эканамічнае часткі прамыслова-эканамічнага кіраўніцтва ліквідуецца.

АБ ПАШЫРЭНЬНІ НА ТЭРЫТОРЫЮ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ НЕКАТОРЫХ ЗАКОНАЎ АБ ПРАЦЫ.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў унесены СНК праэкт пастановы ЦВК і СНК аб пашырэньні на тэрыторыі быўш. Гомельскага і Рэчыцкага паветаў некаторых законаў аб працы, зацьверджаных урадам БССР раней 31-га сьнежня 1926 году.

НАЗНАЧЭНЬНІ.

Тав. Рай Ар. назначан сакратаром Бюджэтнае Камісіі ЦВК БССР.

Тав. Віліянстовіч П. В. аслабаняецца ад абавязкаў члена Камісіі Прыватных Амністый Прэзыдыуму ЦВК.

Тав. Вінаградаў назначаецца членам Камісіі Прыватных Амністый Прэзыдыуму ЦВК.

Насеньне для вясеньняй сяўбы.

Патрэба БССР у насенным матар'яле да вясеньняй пасяўной кампаніі вылічана ў наступнай колькасьці: аўса палепшанага (шведзкага) патрабуецца 134.200 пуд., аўса звычайнага насеннага—500.000 пуд. і ячменю палепшанага—27.000 пудоў.

Зважаючы тое, што ў савецкіх гаспадарках Белсельтрэсту ёсьць 42.000 пуд. палепшанага насеннага аўса і 5.100 пудоў палепшанага ячменю, прызнана неабходным завезьці для поўнага здаволеньня патрэбы ў насеўным матар'яле 92.000 пуд. палепшанага аўса і 500.000 пуд. звычайнага насеннага аўса. Што-ж датычыцца ячменю, то для скарыстаньня на пасеў забраніравана запас гэтага збожжа, які ёсьць у савгасах Белсельтрэсту, у колькасьці 40.000 пудоў.

Водаўг даных Наркамзему, усяго на БССР у савгасах і сялянскіх гаспадарках забраніравана наступная колькасьць чыстасортнага насеньня: жыта—19.128 пуд., аўса—57.798 пуд., ячменю—13.998 пуд., бульбы—104.000 пуд. і канюшыны—2.472 пуды. Гэта насеньне мае быць скарыстана для пасеву ў савгасах і для ўтварэньня дзяржаўнага насеннага фонду.

Наркамзем прымае захады да адшуканьня сродкаў для забесьпячэньня завозу ў БССР насеннага аўса ў колькасьці 592.000 пудоў.

Падагульваючы вышэйсказанае, можна спадзявацца, што да вясеньняга севу мы вадрыхтуемся належна і своячасова.

ПРАЛЕТАРЫЯТ МЕНШЧЫНЫ Ў ПАРТЫЮ ЛЕНІНА.

З часу дзесятай гадавіны да ўчарашняга дня па Менскай акрузе пададзена заяў у партыю.

1)	Па гораду Барысаву	157
2)	Па Гар. райк. (Менск)	62
3)	Па Ляхаўск. „ „	58
4)	Па Кастр. „ „	52
	Усяго	329 ч.

Дадатковая ільгота па с.-г. падатку.

Менскі Арфа разьмеркаваў па райёнах акругі 82.000 руб. на прадастаўленьне згодна маніфесту ўраду дадатковых льгот па с.-гаспадарчым падатку сялянскай беднаце. Праца па разьмеркаваньні гэтай калёгкі сярод сялянства будзе скончана да 20 лістапада.

Хроніка.

Яўрэйскае земляўпарадкаваньне ў Менскай акрузе.

Пачынаючы з 1923 году па апошні час перададзена ў індывідуальнае карыстаньне яўрэям 1122 дзес. зямлі для 198 сем'яў (1000 душ). Пад калектыўным гаспадаркі адведзена 1580 дзес., на якіх арганізавана 14 калектываў—133 сям'і, налічваючых 545 душ.

Акрамя гэтага, на б. тэрыторыі Барысаўскай акр. перадана яўрэйскаму насельніцтву ў карыстаньне 2774 дзес.—576 сем'ям, у гэтым ліку калектыўным гаспадаркам—1313 дзес., на якіх утворана 15 калгасаў.

186.978 руб. на страхавую дапамогу насельніцтву.

Управа Дзяржстраху Беларусі разьмеркавала астаткі мінулых гадоў, у суме 186.978 руб., дзеля страхавой дапамогі насельніцтву—на меры провацыі і рэпрэсіі (дапамога ў розных выпадках, галоўным чынам, папярэджаньне ад пажараў, шляхам агнятрывалага будаўніцтва і інш.), пры чым з агульнай сумы выдзелена на страхаваньне ад агню—118.024 р., на страхаваньне жывёлы—63.861, рэшта—на асабовае і гарантыйнае страхаваньне.

Афармленьне падпіскі на пазыку індустрыялізацыі скончыцца 23 лістапада.

У сувязі з тым, што ў некаторых установах і прадпрыемствах пэнсія выплачваецца пасьля 16 лістапада, першы ўзнос на калектыўных падпісках адкладзен да 23-га лістапада пры ўмове, калі заяўі зроблены да 15 лістапада ўключна.

САЦЫЯЛЬНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ Ў МЕНШЧЫНЕ.

У 897 пачатковых школах і 40 сямёхгодках Меншчыны ў гэтым годзе навучаецца 83654 дзяцей школьнага ўзросту, з якіх 63650 дзяцей, якія навучаюцца ў беларускіх школах.

5-хГАДОВЫ ПЛЯН БУДАЎНІЦТВА КАМХОЗУ.

Менскі аддзел камунальнай гаспадаркі зараз заняты распрацоўкай 5-хгадовага плану камунальнага будаўніцтва ў Менску. Гэты плян у сьнежні будзе разглядацца ў прэзыдыуме гарсавету.

ФІНАНСАВАНЬНЕ САВХОЗАЎ І КАЛХОЗАЎ.

Крэдытны плян Белсельбанку ў бягучым годзе прадбачыць буйнае фінансаваньне калектыўных гаспадарак і савхозаў. Так, на калхозы мяркуецца адпусьціць 1.150.000 руб. крэдыту, а на савхозы і плямхозы—2.425.000 руб.

ЛЕСАМАТАР'ЯЛЫ НАСЕЛЬНІЦТВУ.

Па бягучы год Менскі Акрэа намеціў да водпуску мясцоваму насельніцтву акругі 191.038 куб. мэтраў будоўнай драўніны і 242, 580 куб. мэтраў дроў, на суму 807,166 руб.

Водпуск матар'ялаў ужо адбываецца з 1-га кастрычніка.

БЯСПЛАТНАЯ ВЭТЭРЫНАРНАЯ ДАПАМОГА СЯЛЯНСТВУ.

Бясплатная вэтэрынарная дапамога сялянству з кожным годам павялічваецца. У 1926-27 аперацыйным годзе на гэту мэту было адпушчана 740,494 руб. У той час, як у 1912 г. на вэтэрынарную дапамогу было расходавана па 3-х губэрнях толькі 216,484 руб.

Новы жыльлёвы кодэкс.

ПКУС распрацаваў новы жыльлёвы кодэкс, які прадугледжвае: экспляатацыю муніцыпалізаванага фонду, карыстаньне жыльлёвай плошчай, кватэрную плату, фінансаваньне і крэдытаваньне жыльлёвага будаўніцтва і ўстаноў санітары.

НОВЫ ЗАКАЗЬНІК ДЛЯ ГАДОЎЛІ БАБРОЎ.

Наркамзем'яробства БССР мяркуе арганізаваць у Дрыбінскім раёне, Аршанскай акругі, новы заказьнік для гадоўлі баброў на плошчы ў 190 гэктараў. У апошнім будуць разводзіцца бабры і іншыя каштоўныя зьвяры.

КАМІТЭТЫ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ — БЯДНЯЦКІМ ГАСПАДАРКАМ.

Камітэты ўзаемадапамогі з кожным годам павялічваюць сваю дапамогу бядняцкім гаспадаркам. Так, на 1-га кастрычніка 1927 г. камітэты выдалі беззваротную дапамогу 4,168 гаспадаркам: збожжам—2.383 п. і грашыма—13.339 руб. Акрамя гэтага, камітэты кааперавалі бясплатна 12,537 бядняцкіх гаспадарак.

Нарада пчаляроў.

14—16 лістапада пры Нар. Кам. Земляробства адбылася нарада акруговых інструктароў па пчалярству, у якой удзельнічала 28 чал. Нарада абгаварвала пытаньні аб павялічэньні інструктарскай дапамогі пчалярам і аб арганізацыі пчалярскіх кааперацыйных т-ваў.

30.000 паляўнічых у Беларусі.

Лік паляўнічых беларускага кааперацыйнага саюзу паляўнічых павялічваецца з кожным годам. Зараз беларускі саюз паляўнічых налічвае 30.000 чалавек. З гэтага ліку 87 проц. сялян, 10 проц. рабочых і 3 проц. служачых.

Пашырэньне сетні с.-гасп. кааперацыі.

У часе перавыбарнай кампаніі сельска-гаспадарчай кааперацыі, якая будзе праходзіць з 15 сьнежня да 1 лютага, мяркуецца значна пашырыць пізаную сетку шляхам утварэньня новых 70 таварыстваў с.-гасп. крэдыту.

Пастановы і загады ўраду БССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

аб льготах і складаньні нядоімак, штрафаў і пені па падатках і рэнце з незаможных слаёў насельніцтва.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

I. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР устанавіць парадак дадатковага зьняцьця з бяднейшых сялянскіх гаспадарак адзінага сельска-гаспадарчага падатку з тым, каб агульны лік гаспадарак, з якіх зьняты сельска-гаспадарчы падатак, быў ня меншы 35 проц.

2. Калі сялянская гаспадарка, з якой паводле п. 1-га зьняты ўвесь падатак або частка яго, ужо заплаціла падатак, то ліпшня заплочаная ім сума павінна быць зьвернута.

3. Зьняць усе нядоімкі і пеню па адзіным сельска-гаспадарчым падатку за мінулыя гады з аднадворных і калектыўных гаспадарак, з якіх зьняты ўвесь адзіны сельска-гаспадарчы падатак або частка яго ў 1927-28 акладным годзе (па неабкладным мінімуме або за рахунак асноўнага, або прадугледжанага пунктам першым дадатковага фондаў скідак).

4. Аднадворовым і калектыўным гаспадаркам, з якіх у 1927-28 годзе ня зьняты ўвесь адзіны сельска-гаспадарчы падатак або частка яго (п. 3.), даюцца льготы па нядоімках мінулых гадоў па 1926-27 год уключна, у наступным разьмеры:

а) з гаспадарак, якія маюць ня больш 60 рублёў абкладанага даходу на едака, зьнімаецца 50 проц. нядоімкі; б) з гаспадарак, якія маюць ад 60 да 80 рублёў абкладанага даходу на едака, зьнімаецца 25 проц. нядоімак; в) пры частковым зьняцьці нядоімкі зьнімаецца таксама ўся пеня.

5. Прыняць на дзяржаўны кошт земляўпарадкаваньне ўсіх бядняцкіх сялянскіх гаспадарак і незаможных гаспадарак сераднякоў, для чаго прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР, апроч асигнаваньняў прадугледжаных у бюджэце на 1927-28 год, асигнаваць дадатковую суму.

6. Зьняць нядоімкі і пеню па абавязковым акладным страхаваньні, якія лічацца на 7-е лістапада 1927 году за аднадворовымі і калектыўнымі гаспадаркамі, з якіх у 1927-28 акладным годзе зьняты ўвесь адзіны сельска-гаспадарчы падатак або частка яго.

7 Вызваліць асоб, якія належаць да аднадворовых і калектыўных гаспадарак, з якіх у 1927-28 акладным годзе зьняты ўвесь адзіны сельска-гаспадарчы падатак або частка яго, ад уплаты карнявой каштоўнасьці самавольна пасечанага ім лесу ў разьмеры, які перавышае ардынарную яе велічыню.

8. Зьняць усе нядоімкі, штрафы і пені, якія лічацца на 7-ае лістапада 1927 году:

а) за асобамі, якія да 7-га лістапада 1927 году работаюць па найму, або зьяўляюцца дзяржаўнымі пэнсіянэрамі і, апроч заработнай платы або пэнсіі, ня маюць ніякіх крыніц даходаў;

б) за асобамі, якія займаюцца сельскаю гаспадаркаю, калі з гаспадарак, членамі якіх яны зьяўляюцца, зьняты ўвесь адзіны сельска-гаспадарчы падатак на 1927-28 акладны год або частка яго;

в) за асобамі, якія да 7-га лістапада 1927 г. лічацца інвалідамі працы і вайны і займаюцца гандлем або промысламі, калі яны ў 1927-28 акладным годзе вызваляюцца поўнасьцю або ў паловым разьмеры ад прамысловага падатку і, калі пры гэтым даход іх, які абкладаецца падаходным падаткам, у гэтым-жа годзе не перавышае павялічанага ў паўтары разы неабкладанага мінімуму:

1) па агульна-грамадзкім падатку для дапамогі галадуючым і на ўзмацненьне сродкаў па змаганьню з пошасьцямі;

2) па адначасовым агульна-грамадзянскім падатку для дапамогі сельскай гаспадарцы;

3) па працоўным гужавым падатку;

4) па падатку з асоб, якія атрымоўваюць вялікую заработную плату;

5) па адначасовым падатку на патрэбы насельніцтва, якое пацярпела ад неўраджаю;

6) па прамысловым падатку;

7) па падаходна-маемасным падатку;

8) па падаходным падатку;

9) па гэрбавым зборы;

10) па падатку са спадчыны;

11) па судовых пошлінах;

12) па падатках з будоў;

13) па падатках з жывёлы;

14) па падатках з транспартных сродкаў.

Увага 1-я: льготы, паказаныя ў 8-м пункце гэтае пастановы, пашыраюцца і на тых рабочых, служачых і дзяржаўных пэнсіянэраў, якія, апроч заработнай платы або пэнсіі, маюць літаратурны заработак, у тым ліку на рабочых і сельскіх карэспандэнтаў.

Увага 2-я: льготы, паказаныя ў 8-м пункце, пашыраюцца і на тых асоб, якія да 7-га лістапада 1927 году зьяўляюцца беспрацоўнымі, зарэгістраванымі на біржы працы.

Увага 3-я: гэты пункт пашыраецца і на мясцовыя надбаўкі да дзяржаўных падаткаў.

9. Зьняць палову нядоімак, штрафаў і пені па падатках (і мясцовых надбаўках), паказаных у пункце 8-м гэтае пастановы, якія лічацца на 7 лістапада 1927 г. за асобамі, крыніцай існаваньня якіх да 7 лістапада 1927 г. зьяўляецца плата за асабістую працу ня ў наймах, калі даход іх, які абкладаецца падаходным падаткам за 1927-28 абкладны год, не перавысіў павялічанага ў паўтары разы неабкладнага мінімуму.

10. Зьняць усе нядоімкі, штрафы і пені, якія лічацца на 7 лістапада 1927 г. за асобамі, паказанымі ў п. п. 8 і 9 гэтае пастановы, па спагнаньню асноўнай і дадатковай рэнты за мінулы час.

11. Зьняць нядоімкі і пені па асноўным падаходным падатку за час да 1-га кастрычніка 1926 году, якія лічацца за саматужнікамі, працуючымі без наймовых рабочых.

12. Зьняць нядоімкі па штрафах, накладзеных на саматужна-прамысловыя арцелі, якія працуюць без наймовых рабочых, арцелі інвалідаў і працоўныя калектывы безработных, за парушэньне да 7 лістапада 1927 г. палажэньня аб дзяржаўным прамысловым падатку.

13. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў і Народнаму Камісарыяту Сацыяльнае Забясьпекі зараз-жа прыступіць да падрыхтоўкі к паступоваму забесьпячэньню за кошт дзяржавы састарэлых асоб з незаможных слаёў сялянства.

14. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў і Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР сьпісаць усе назычкі, або частку іх, якія выданы да 7-га лістапада 1927 г. Беларускім Сельска-Гаспадарчым Банкам бяднейшаму сялянству для ліквідацыі вынікаў навальных бядот (градабіцьця, навальніц, пажараў).

15. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў і Народнаму Камісарыяту Земляробства сьпісаць усю насенную назычку або частку яе, якая выдана дзяржаўнымі ўстановамі незаможным сялянскім гаспаркам з 1922 году да вясны 1927 году.

16. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Беларускаму Сельска-Гаспадарчаму Банку распрацаваць і падаць на зацьверджаньне ў устаноўленым парадку праэкт арганізацыі калёнізацыйных фондаў на забалочаных землях для іх засяленьня ў першую чаргу бяднейшым сялянствам.

17. Абавязаць Беларускі Сельска-Гаспадарчы Банк: а) падаць у устаноўленым парадку праэкт пастановы аб спэцыяльным крэдытаваньні бяднейшага сялянства для куплі маемасьці ў асоб, якія перасяляюцца за межы рэспублікі і для аплаты арэнды за зямлю, з тым, каб уся зямля перасяленцаў пераходзіла ў арэндное карыстаньне беднаты; б) перагледзець тэрміны крэдытаваньня на перабудаваньне гаспадаркі і забесьпячэньне сельска-гаспадарчым інвэнтаром, бяднейшага сялянства, якое земляўпарадкоўваецца ў напрамку павялічэньня тэрмінаў крэдытаваньня.

18. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР надзяліць з запаснага зямельнага фонду, а таксама за рахунак мэліараваных наўдобных зямель у першую чаргу сялянскую беднату, а з яе пераважна чырвонаармейцаў—актыўных удзельнікаў грамадзянскай вайны і чырвоных партызан.

19. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР на час правядзеньня земляўпарадкаваньня павялічыць агульную суму крэдытаваньня лесаматар'ялямі сялянскай беднаты, у першую чаргу тае, якая земляўпарадкоўваецца.

20. Для палягчэньня цяжкага матар'яльнага становішча бяднейшага местачковага насельніцтва, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства распрацаваць пытаньне аб земляўпарадкаваньні і гаспадарчым адбудаваньні мястэчак.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

10 лістапада 1927 г.
гор. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

о льготах, сложении недоимок, штрафов и пени по налогам и ренте с малоимущих слоев населения.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постанавляют:

1. Поручить Народному Комиссариату Финансов БССР установить порядок дополнительного снятия с беднейших крестьянских хозяйств единого сельско-хозяйственного налога с тем, чтобы общее число хозяйств, с которых снимается сельско-хозяйственный налог, было не меньше 35 проц.

2. Если крестьянское хозяйство, с которого на основании п. I снят весь налог, или часть его, уже заплатило налог, то излишне внесенная им сумма должна быть возвращена.

3. Снять все недоимки и пени по единому сельско-хозяйственному налогу за прошлые годы с единоличных и коллективных хозяйств, с которых снят весь сельско-хозяйственный налог или часть его в 1927.28 окладном году (по необлагаемому минимуму, или за счет основного или предусмотренного п. I дополнительного фондов скидок).

4. Единоличным и колективным хозяйствам с которых в 1927-28 году не снят весь единый сельско-хозяйственный налог или часть его (п. 3), даются льготы по недоимкам прошлых лет по 1926-27 г. включительно, в следующем размере:

